

КАРАНАВІРУС. І Ў БЕЛАРУСІ, НА ЖАЛЬ, ТАКСАМА

4

У ШКОЛУ ХОДЗЯЦЬ. А ЕЗДЗІЦЬ НЕЛЬГА?

7




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 ЛЮТАГА 2020 г. СУБОТА № 41 (29155)


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы стварылі дзяржаву, галоўнымі каштоўнасцямі якой з'яўляюцца людзі і справядлівае да іх стаўленне»

## Пра што гаварыў Аляксандр Лукашэнка на VIII з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў

**Пытанні, якія хвалююць кожнага: і таго, хто працуе, і таго, хто ўжо заслужыў адпачынак, і рашэнні, якіх чакалі. Усё гэта было ў выступленні Аляксандра Лукашэнкі ў Палацы культуры прафсаюзаў. Нездарма прамова кіраўніка дзяржавы неаднаразова выклікала апладысменты ва ўдзельнікаў з'езду. «Мы маем усе падставы сцвярджаць, што ў найноўшай гісторыі прафсаюзны рух з'яўляецца паўнапраўным удзельнікам будаўніцтва нашай краіны. Мы стварылі дзяржаву, галоўнымі каштоўнасцямі якой з'яўляюцца людзі і справядлівае да іх стаўленне. Гэты выбар прадвызначыў далейшае развіццё партнёрскага ўзаемадзеяння паміж уладай і грамадскімі арганізацыямі», — перакананы Прэзідэнт.**

**Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў нашай краіне мэты дзяржаўнага развіцця і інтарэсы народа супадаюць. Дзякуючы гэтаму адзінству гісторыя суверэннай Беларусі не ведала масавых супрацьстаянняў і «паказальных» выступленняў грамадскіх арганізацый, прыклады чаго мы так часта назіраем у міжнародных навінах.**

**«Беларускі народ выбраў шлях сацыяльнага дыялогу, і мы не раз пераконваліся ў яго разумнасці і перспектыўнасці», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**



Фота БелТА.

**На з'ездзе адбыўся і ўрачысты момант: Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў знак сваёй і беларускага народа павагі да прафсаюзнай арганізацыі краіны ўручыў старшыні ФПБ Ганаровы дзяржаўны сцяг.**

### «Дэмакратыя» ці дэмакратыя?

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: у Беларусі працоўныя абароненыя як ні ў якой іншай краіне — ад Канстытуцыі да зусім нядаўна прынятага Указа па датэрміновых прафесійных пенсіях. Пры гэтым ён выказаў занепакоенасць скарачэннем колькасці членаў прафсаюзаў у некаторых суседзяў.

«Напрыклад, па звестках Міжнароднай арганізацыі працы, у Эстоніі толькі 5 працэнтаў работнікаў знаходзіцца ў прафсаюзе, у Літве — 8 працэнтаў, у Польшчы — 13 працэнтаў. Ну, гэта называецца «дэмакратыя». У выніку прафсаюзы пазбаўленыя магчымасці выступаць паўнавартасным бокам сацыяльнага партнёрства. Руйнуецца сістэма так званага трыпартызму і ў цэлым сацыяльнага балансу ў грамадстве», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым ёсць і іншыя прыклады — Ісландыя, Швецыя, Данія, дзе ахоп прафсаюзным членствам складае ад 70 да 90 працэнтаў. У Беларусі гэты паказчык — 93 працэнты.

«Поспехі нашай Федэрацыі ў рабоце па стварэнні пярвічных прафсаюзных арганізацый уражваюць. Усяго з 2015 года з'явілася больш за 4200 новых прафсаюзных арганізацый, з іх 75 працэнтаў — на прыватных прадпрыемствах. Заслугоўвае ўвагі работа па мадэрнізацыі вашых структур. ***Сёння прафсаюзы — гэта ўжо не разрозненыя арганізацыі, а адзіны рух, з якім лічацца і голас якога чуюць і наймальнікі, і органы ўлады***», — прызнаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

КОРАТКА

- **Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця Беларусі — 2035 плануюць унесці ў Саўмін да 1 красавіка.**
- Першыя выпрабаванні айчыннай зенітнай кіраванай ракеты паспяхова прайшлі ў Беларусі.
- **Польшча зацікаўлена ў пастаўках нафты ў Беларусь.**

ISSN 1990 - 763X

Тэндэнцыя

# ПОКЛІЧ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

## Гараджан, якія з выхадам на пенсію вяртаюцца ў бацькоўскія дамы, становіцца ўсё больш

**Не сказаць, што тэма новая, але... Упершыню задумацца над гэтай тэндэнцыяй прымусіла сустрэча з цікавым чалавекам. Валерый Аляксандравіч ЖЭДЗЬ пераехаў у амаль пустую вёску Акольнік, што ў Белавежскай пушчы, з Мінска адразу пасля выхаду на пенсію. Інжынер-будаўнік па спецыяльнасці, за сваё жыццё шмат чаго ўзвёў спачатку ў Малдове, дзе ўзначальваў вялікае будаўнічае ўпраўленне, а потым і ў нашай сталіцы.**

### Нашчадак тыповага жыхара пушчы

Некалі яны з жонкай, выпускнікі Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, паехалі ў Кішынёў па размеркаванні. Там Валерый зрабіў паспяховую кар'еру. Жылі, працавалі, мелі дастатак. Але ж вядомыя падзеі на рубяжы стагоддзяў прымусілі сям'ю пакінуць звыклае месца. Прадалі дзве добрыя кватэры, астатнюю маёмасць — за гэта ледзьве купілі невялічкую кватэру ў Мінску. Тут і рабілі да пенсіі. Тым часам бацька Валерыя Аляксандравіча, які жыў у вёсцы, расхварэўся, яму быў патрэбны догляд, і сын перабраўся ў Акольнік. Потым тут зарэгістраваўся, абжыўся і не захацеў пераязджаць назад у сталіцу. Жонка Валянціна Сяргееўна жыве цяпер на два дамы, летам — больш у вёсцы, зімой — больш у горадзе. Яна, былая брастаўчанка, мае гарадскі менталітэт, ёй тут часам становіцца сумна, тады яна едзе ў сталіцу, дзе магазіны, кавярні, тэатры, шум і тлум.

СТАР. 5



Валерый ЖЭДЗЬ.

# «Мы стварылі дзяржаву, галоўнымі каштоўнасцямі якой з'яўляюцца людзі і справядлівае да іх стаўленне»

## Найважнейшае пытанне

У кампетэнцыі Федэрацыі — рост і своечасовая выплата заработнай платы, забеспячэнне поўнай і прадукцыйнай занятасці, падтрымка найбольш уразлівых катэгорый работнікаў, паляпшэнне ўмоў працы, кантроль выканальніцкай і працоўнай дысцыпліны, павышэнне прадукцыйнасці працы і якасці прадукцыі, якая выпускаецца, кантроль цэнаўтварэння ў краіне.

«Але ёсць вынікі, пра якія можна гаварыць ужо сёння. Гэта макраэканамічная стабільнасць і зніжэнне інфляцыі. Задача захаваць інфляцыю на ўзроўні не вышэй за 5 працэнтаў выконваецца, нягледзячы на наймацнейшы знешні ціск. Вы самі бачыце, як складваюцца адносіны з нашымі асноўнымі партнёрамі», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Не стаў утойваць ён і кірункі, дзе ёсць недапрацоўкі. Сярод іх — эфектыўнасць сельскагаспадарчага комплексу, асобныя праекты па мадэрнізацыі прамысловасці, развіццё адукацыі і навукі. Гэтыя кірункі давядзецца дэталёва прааналізаваць разам з эканамічным блокам краіны.

***«Трэба ў любым выпадку захаваць вытворчасці і працоўныя калектывы. Мы гэта рабілі заўсёды, нават у самыя складаныя часы***. Людзей на вуліцу не выкідалі. Заробак, няхай і не самы высокі, плацілі. ***На гэтыя два найважнейшыя для прафсаюзаў пытанні — занятасць і заработная плата — мы заўсёды будзем звяртаць самую пільную ўвагу***», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што на V Усебеларускім сходзе была пастаўлена задача стварыць за пяцігодку не менш за 250 тысяч новых рабочых месцаў.

«Калі глядзець выключна на лічбы, то нібыта задача выконваецца, вырашаецца. Але пытанне ў якасці гэтых паказчыкаў. ***Новыя рабочыя месцы павінны быць высокапрадукцыйныя. Калі ж там зарплата 400, 500 рублёў, то такое рабочае месца нікому не трэба.*** Звярніце ўвагу на гэтыя моманты. Заработная плата, безумоўна, найважнейшае пытанне для людзей, і яно заўсёды мусіць быць у полі зроку прафсаюзаў», — заклікаў прафсаюзы Прэзідэнт.

Найбольшую занепакоенасць кіраўніка дзяржавы выклікаюць факты несвоечасовай выплаты зарплаты.

«Вось гэта трэба выпальваць гарачым жалезам, не лічачыся ні з чым. ***Адказнасць кіраўнікоў прадпрыемстваў мусіць быць адназначнай***. Калі ты кіраўнік, падумай аб тых людзях, якія працуюць. Дарэчы, працуюць і на цябе. Таму зарплату кроў з носу плаціць трэба», — загадаў Аляксандр Лукашэнка.

Такая сітуацыя характэрная для шэрагу сельскагаспадарчых арганізацый Віцебскай вобласці. Прычым у некаторых выпадках у студзені людзі не атрымалі разлік за кастрычнік мінулага года. Больш за тое, людзі не толькі не атрымліваюць зарплаты, але і пазбаўляюцца часткі пенсіі, бо наймальнікі не плацяць за іх узносы ў Фонд сацыяльнай абароны.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Гэта, канешне, недапушчальна. Напэўна, Камітэт дзяржкантролю, урад, пракуратура чакаюць чарговых маіх жорсткіх даручэнняў. Не хацелася б прыбягаць да гэтай жорсткасці. У адваротным выпадку мы затрымаем зарплату ўсім пералічаным структурам і выплацім за гэты кошт (пачынаючы ад урада і заканчваючы старшынямі райвыканкамаў) зарплату тым людзям, якім не выплачана ў той жа Віцебскай і іншых абласцях», — папярэдзіў лідар краіны.

Ён чарговы раз падкрэсліў: тое, што чалавек зарабіў, павінна быць яму выдадзена безумоўна. Добра, што сёння прафсаюзы ў кожным канкрэтным выпадку разбіраюцца, хто працуе, а хто не. «І гэтая тэндэнцыя будзе толькі ўзмацняцца. ***Мы не павінны агулам усіх абараняць — мы мусім забяспечыць абарону тым, хто працуе. Хто не жадае, таго трэба навучыць альбо прымусіць***. Трэба дыферэнцыраваць у працоўных калектывах. І я вам гэта кажу як чалавек, які прайшоў ваш шлях, — я быў кіраўніком пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі. Даводзілася і прымушаць людзей працаваць. ***Чалавек-працаўнік павінен быць абаронены. Грошай шкадаваць для такіх людзей не трэба***. Вы самая галоўная сіла, і я гэтага ніколі не хаваў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.



## Даражэй за грошы

Яшчэ адным важным момантам Прэзідэнт назваў заработную плату работнікаў бюджэтных арганізацый.

«Вы ведаеце, што ўведзеныя новыя падыходы да яе налічэння. Задача новаўвядзення — зрабіць сістэму больш празрыстай, зразумелай. Пры гэтым ***маім патрабаваннем было не дапусціць зніжэння зарплаты ні на капейку. Лепш дзесяць капеек дадаць да таго, што было, каб не было размоў***. Бо ўсякія размовы і дэманстрацыі, як я часта кажу, «плявузганні» на гэтую тэму будуць даражэй каштаваць за гэтыя дзесяць капеек», — разважае Аляксандр Лукашэнка.

Па яго інфармацыі, у чацвёртым квартале мінулага года па краіне дасягнуты ўзровень зарплаты бюджэтнікаў не ніжэй за 80 працэнтаў ад узроўню зарплаты па краіне. На 2020 год пастаўлена дакладная задача захаваць гэтыя паказчыкі.

«Нядаўна мне дакладваў міністр фінансаў, і ў нас не проста ёсць надзея — мы абавязкова гэты ўзровень захаваем, для гэтага ёсць адпаведныя сродкі. ***Зарплата настаўніка павінна дасягнуць 100 працэнтаў ад сярэдняй па краіне, а ўрача — 150»***, — абазначыў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, у цэлым прафсаюзы сумесна з Міністэрствам працы мусяць узяць на кантроль тыя арганізацыі, дзе ўзровень зарплаты ніжэйшы за 500 рублёў. Больш за тое, летась ураду была пастаўлена задача прааналізаваць зарплаты, ніжэйшыя за 500 долараў у эквіваленце.

«І давайце шчыра разважаць: ***калі жадаеш жыць лепш, працаваць трэба больш***. Мы захацелі рынку, уступілі ў гэты рынак — а гэта канкурэнцыя. Канкурэнцыя на рынку працы, як у нас модна казаць, канкурэнцыя за добрае рабочае месца, за добрую заработную плату і гэтак далей», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Задача прафсаюзаў — давесці факты, якія ідуць уразрэз з палітыкай справядлівасці, і настройваць работнікаў менавіта зарабляць.

Прэзідэнт даручыў сур'ёзна разабрацца і з пытаннямі, якія ўзніклі ў людзей пасля атрымання заработнай платы за студзень.

«Мне яшчэ выніковага даклада няма, але некаму мала не будзе, калі нехта не растлумачыў. Але справа не ў тлумачэннях. Вы што, на месцах не можаце налічыць няшчасную заработную плату?» — яшчэ раз падкрэсліў кіраўнік краіны.

## «Банкруцтва ў Беларусі быць не павінна!»

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што прафсаюзы павінны непасрэдна ўдзельнічаць у працэсах рэструктурызацыі прадпрыемстваў, асабліва калі плануецца звальненне работнікаў.

Пры гэтым Прэзідэнт лічыць, што многія антыкрызісныя кіраўнікі не выконваюць сваю задачу па аднаўленні і перазапуску прадпрыемстваў-банкрутаў. У большасці выпадкаў адбываецца раскраданне і ліквідацыя.

***«Давайце і ва ўрадзе, і ў прафсаюзах, садзіцеся за стол разам і думайце, што нам рабіць з так званым банкруцтвам — быць яго не павінна ў Беларусі!*** — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. — Бо гэта ўсё за кошт людзей. І гэта ж потым нам даражэй атрымліваецца. Мы больш выдаткоўваем грошай на барацьбу са злачыннасцю, бо людзі ідуць у злачынны свет, спрабуючы зарабіць дурныя грошы. Навошта мы ствараем гэтыя праблемы? ***У нас няма прадпрыемстваў, якія не могуць працаваць на рынку»***.

Працаваць у рынкавых умовах змогуць усе, некаторых трэба толькі падтрымаць. Тут Прэзідэнт прывёў у прыклад Добрушскі фарфоравы завод. Кіраўнік дзяржавы даручыў аблвыканкаму і ўраду падтрымаць гэта ўнікальнае для Беларусі прадпрыемства. Гэта датычыцца і электралямпавага завода ў Брэсце, і іншых вытворцаў прадметаў першай неабходнасці.

«На такія прадпрыемствы, якіх адзінкі, мы не звяртаем увагі, пакуль Прэзідэнт не паедзе і па галаве не дасць», — з горыччу заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца перанавучання, лідар краны лічыць, што перш за ўсё важна захаваць людзей, якія ўжо валодаюць пэўнымі кампетэнцыямі: ***«Нельга не падумаўшы, пад лозунгам рэструктурызацыі кідацца закрываць прадпрыемствы, потым перавучваць людзей. Лепш захавайце спецыялістаў, якія ёсць, падвучыце ў арганізацыі працы, тэхналогіях, падцягніце да патрэбнага ўзроўню»***.

Прафсаюзы адчуваюць змяненне запытаў рынку працы: якія спецыяльнасці і кампетэнцыі патрэбны сёння, што будзе запатрабавана эканомікай у перспектыве, канстатаваў Прэзідэнт.

«Тут я бачу звязку з Міністэрствам адукацыі. ***Пад новыя высокапрадукцыйныя працоўныя месцы з годнай аплатай патрэбны добра падрыхтаваны персанал»***, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асобна кіраўнік дзяржавы спыніўся на абароне жанчын, якія працуюць. «У іх руках дэмаграфічная бяспека дзяржавы. Сям'я, маці — гэта святое. ***Правы маці ў плане працоўнай занятасці павінны быць непахісна абароненыя!*** — акцэнтаваў Прэзідэнт. — Не ў кожнай краіне жанчыны, якія нарадзілі трох-чатырох дзяцей, могуць спакойна вярнуцца на працу, як у Беларусі».

## «На вытворчасці ёсць дыктатура тэхналогій»

Прэзідэнт адзначыў: прыкладаў, калі прафсаюзы нароўні з парламентарыямі выступаюць распрацоўшчыкамі праекта закона па змяненні Працоўнага кодэкса, як гэта адбываецца ў нашай краіне, у свеце практычна няма. ***«Працоўны кодэкс — гэта прававы дакумент. Пры яго карэкціроўцы павінны быць улічаныя інтарэсы кожнага работніка***. А хто, калі не прафсаюзы, змогуць іх выказаць і адстаяць? Як, напрыклад, вы адстаялі працягненне кантрактаў з добрасумленнымі работнікамі на максімальны тэрмін», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Навошта кіраўніку падстрахоўваць сябе заключэннем кантракта на год, калі можна прапісаць усе ўмовы, пры якіх чалавек будзе звольнены, задаўся пытаннем Аляксандр Лукашэнка. «Не трэба ў дэмакратыю на вытворчасці гуляць. На вытворчасці няма ніякай дэмакратыі. На вытворчасці ёсць дыктатура тэхналогій, — адзначыў ён. — ***Усе, ад кіраўніка да слесара, павінны падпарадкоўвацца тэхналагічнай дысцыпліне»***.

На жаль, маюцца сігналы пра неналежную якасць беларускіх тавараў. У вялікіх аб'ёмах, як гэта было раней, мы вырабляць не будзем, рынак звужаецца, але патрабаванні да якасці растуць», — сказаў Прэзідэнт.

Пакуль у свеце маюцца крызісныя з'явы (не толькі ў эканоміцы, але і ў сферы аховы здароўя, як паказала сітуацыя з распаўсюджваннем каранавіруса ў свеце) мы, хутчэй за ўсё, не здолеем значна павысіць аб'ёмы сваёй вытворчасці, выказаў меркаванне Прэзідэнт. Таму стаўку трэба рабіць на яе якасць. Ён нагадаў пра спакусу шмат гадоў таму, якой нашай краіне ўдалося пазбегнуць, — зрабіць беларускія прадукты больш таннымі за кошт якасці. У выніку беларускія прадукты, па словах кіраўніка дзяржавы, ведаюць ва ўсім свеце і яны карыстаюцца попытам.

## Ціха, спакойна, без гвалту, без шуму...

Да слова, пра каранавірус. Аляксандр Лукашэнка ўхваліў рашэнне беларускіх медыкаў пакуль не закрываць мяжу. «У нас ёсць месцы, дзе мы можам назіраць людзей, якія прыбылі (з эпідэміялагічна небяспечных рэгіёнаў — ***«Зв.»***)», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пахваліў беларуску, якая навучаецца ў Італіі, за тое, што яна звярнулася ў Міністэрства аховы здароўя Беларусі адразу як даведалася, што яе суседка па пакоі ў міланскім інтэрнаце захварэла. Гэта дазволіла пачаць дзейнічаць яшчэ ў Польшчы і ізаляваць яе і яе бацькоў яшчэ да перасячэння мяжы, а потым адразу змясціць іх пад медыцынскае назіранне.

Станоўча ацаніў Прэзідэнт і спакойныя адносіны грамадства да выпадку з іранскім студэнтам, у якога выявілі вірус. ***«Ціха, спакойна, без гвалту, без шуму мы робім тое, што робяць усе»***, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што закрыццё граніц не дае эфекту: «Пры такіх глабальных зносінах — гэта дарэмна».

***Падобным чынам, без залішняга шуму, кіраўнік дзяржавы заклікаў працаваць па ўсіх напрамках***.

## Найлепшая пенсійная сістэма з улікам магчымасцяў дзяржавы

«Усе палажэнні, якія датычацца занятасці, рэструктурызацыі прадпрыемстваў, змянення сістэмы разліку заработнай платы, павінны разглядацца пры ўдзеле прафсаюзаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Новыя ініцыятывы, з якімі сёння выступае ФПБ будуць разгледжаны на адмысловай нарадзе, каб выпрацаваць збалансаваную пазіцыю, паабяцаў Прэзідэнт.

Асаблівай увагі заслугоўвае ініцыятыва прафсаюзаў па ўнясенні змяненняў у пенсійнае заканадаўства, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Пенсійная сістэма ў тым выглядзе, у якім мы яе сёння выкарыстоўваем, сябе вычарпала, — упэўнены Прэзідэнт. — І пасля прэзідэнцкіх выбараў усё роўна прыйдзецца гэтым займацца. Калі застанемся ў гэтым складзе, мы сёлета, у канцы года, пачнём гэту работу. ***Трэба зрабіць так, каб чалавек, калі працуе, разумеў: буду лепш працаваць, буду лепш зарабляць, — на пенсіі будзе лепш. Ураўнілаўкі быць не павінна»***.

# Прафсаюзы. «Мы аб'ядноўваем»

**Аб дасягненнях, складанасцях і перспектывах у працы на VIII з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў расказалі прадстаўнікі руху**



Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што з выкарыстаннем сусветнага вопыту, у тым ліку суседніх краін, у Беларусі будзе створана найлепшая сістэма пенсійнага забеспячэння з улікам магчымасцяў дзяржавы.

«Найлепшая — гэта не значыць, што ўсіх завалім вялікімі пенсіямі. Але гэта будзе справядлівая і добрая сістэма, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка і падкрэсліў: — ***Абарона інтарэсаў пенсіянераў з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам для дзяржавы***».

## Кантроль за цэнамі — задача прафсаюзаў

Цэны — яшчэ адно пытанне, якое знаходзіцца ў полі зроку прафсаюзаў. Кантраляваць кошт прадуктаў першай неабходнасці — гэта асаблівая задача для ФПБ.

У свой час ураду, Міністэрству антыманапольнага рэгулявання і гандлю, прафсаюзам было дадзена даручэнне забяспечыць прымальныя цэны на найбольш значныя тавары, ад якіх залежыць жыццё перш за ўсё малазабяспечанага насельніцтва і пенсіянераў.

«Што маем цяпер? Як я ўжо сказаў, агульныя паказчыкі быццам нядрэнныя. Што датычыцца прадуктаў харчавання. Насцярожваюць дадзеныя за студзень бягучага года — цэны выраслі больш чым на 1 працэнт», — адзначыў лідар дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на стаючую тэндэнцыю па захаванні інфляцыі на ўзроўні пяці працэнтаў. «Але тэмпература па бальніцы сярэдняя», — заўважыў кіраўнік краіны і нагадаў пра нізкія заробкі ў сферы культуры і дашкольнай адукацыі.

Сітуацыя цікавая — інфляцыя трымаецца на пастаянным узроўні ў пяць працэнтаў, але кошт прадуктаў расце. Абурае Прэзідэнта айчынная «малочка», якая на працягу года пастаянна даражэе: «Ідыятызм поўны. ***Малако дзявацца няма куды, а цэны пастаянна растуць. Не можам свой народ забяспечыць гэтым прадуктам***. Прафсаюзы не павінны заставацца ўбаку, — сказаў Аляксандр Лукашэнка і дадаў: Вырашыце, Міхаіл Сяргеевіч (Орда — ***Зв.***), гэту задачу. Вы першы ў гэтым радзе. Не МАРТ, не ўрад. Абараніце людзей. Вы ў стане гэта зрабіць».

## Для іх няма «сваіх» і «чужых»

Прафсаюзы — гарант і абаронца правоў работнікаў у тым ліку і на прадпрыемствах прыватнага сектара. Пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі дарэчныя і там. Работа па іх стварэнні вядзецца, але натыкаецца на складанасці. І вось чаму. «Прыватніку не заўсёды зручна мець у сябе прафсаюз, які будзе сачыць за выкананнем правоў работнікаў, прымушаючы часам паступацца сваімі фінансавымі інтарэсамі. Але дзяржава пайшла на лібералізацыю ўмоў для бізнесу. ***Дык пакажыце ж і вы сваю сталасць, здольнасць несці сацыяльную адказнасць перад людзьмі»***, — заключыў Прэзідэнт.

Пакуль прыватнікі разважаюць, прафсаюзы не дзеляць работнікаў на «сваіх» і «чужых». Наёмныя работнікі бізнесменаў маюць магчымасць звяртацца па дапамогу ў раённыя, цэнтральныя органы прафсаюзаў. А каб разважалі бізнесмены не досыць доўга, з прыняццем рашэння ім дапамог кіраўнік краіны. «Падрыхтуйце, калі не разумеюць, мой указ па стварэнні на прыватных прадпрыемствах пярвічных прафсаюзных арганізацый», — даручыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што гэта не раптоўнае рашэнне. Кожны раз, дакладваючы лідару дзяржавы аб стане спраў у арганізацыі, Міхаіл Орда звяртае ўвагу на нежаданне прыватных арганізацый ствараць прафсаюзныя ячэйкі.

«Прыватнікі як ставяць пытанне: чаго вы ўсё «дзяржаўныя, дзяржаўныя прадпрыемствы»? ***Вы і нас пастаўце ў роўныя ўмовы з дзяржаўнымі прадпрыемствамі. Вось мы іх і паставім»***, — пажартаваў Аляксандр Лукашэнка.

## Гарантыі для бяспекі

Абараняюць прафсаюзы не толькі правы, але і здароўе, і нават жыццё людзей. За тры гадоў ФПБ выявіла больш за 300 тысяч парушэнняў у ахове працы. Спынена звыш 10 тысяч адзінак машын і абсталявання, якія маглі стаць прычынай траўмавання людзей. Але на працягу двух гадоў траўматызм на вытворчасці расце. Прэзідэнт даручыў знаходзіць яго прычыны і прымаць жорсткія рашэнні.

«Гэта не нашы людзі загінулі, не ў вашай сям'і, не вашы родныя. А хтосьці ж страціў кармільца. Хтосьці да гэтага часу пакутуе, што загінуў сын, загінулі бацькі. І не ўсе па п'янцы, а з-за нашай бязладнасці, бескантрольнасці ці людзей, якія не стварылі нармальных умоў. ***Таму трэба нам больш жорстка падыходзіць да пытанняў кантролю за нармальным станам вытворчасці ў плане аховы працы»***, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён параіў прафсаюзам, калі яны лічаць, што для кантролю ім неабходна больш правоў, звярнуцца да яго з гэтым пытаннем.

## З асаблівай місіяй у грамадстве

Па словах Прэзідэнта, раней да прафсаюзаў было ганебнае стаўленне. Іх называлі «адстойнікам», а самых няздольных супрацоўнікаў адпраўлялі ў гэтыя органы. Цяпер сітуацыя змянілася кардынальна. Аляксандр Лукашэнка пахваліў кіраўніка рэспубліканскіх прафсаюзаў, якому ўдалося выкараніць такую практыку.

На пасадах у прафсаюзах павінны, на яго думку, працаваць прыгожыя і багатыя ўнутраным светам людзі.

«Вось кажуць, што ў нас няма грамадзянскай супольнасці. Скажу, яна ёсць. Але аснову грамадзянскай супольнасці не апазіцыянеры ўзначальваюць. ***Грамадзянская супольнасць у нас — гэта, па-першае, прафсаюзы ветэранскія, жаночыя, маладзёжныя арганізацыі і грамадская арганізацыя «Белая Русь»***, — пералічыў лідар краіны.

Ён падзякаваў прафсаюзам за дапамогу ў арганізацыі выбараў у Нацыянальны сход. Дзякуючы ў тым ліку і ФПБ удалося сфарміраваць парламент, які працуе.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, за што больш за ўсё паважае прафсаюзы. Без дзяржаўнай дапамогі яны ўзялі на ўлік і прывялі ў парадак санаторыі, прафілакторыі і іншую ўласнасць арганізацыі.

***«Я за гэта вас цаню, што вы па-гаспадарску адносіцеся да свайго дабра.*** І многім дзяржаўным служачым у вас яшчэ трэба вучыцца. Вось адсюль мае адносіны да вас — за вашу ролю ў грамадстве і за тое, што вы робіце, захоўваючы тое, што вам дасталося».

Прэзідэнт падзякаваў арганізацыі і за акцыю «Мы — разам!» пад дэвізам «З вялікай любоўю да малой радзімы». «Усе мы старэем, маладзейшымі не будзем. А чым старэйшы, тым больш цябе кліча малая радзіма. Таму ***мы тры гады аддалі малой радзіме. Я думаю, трэці, фінішны, у нас будзе ўдарны, каб мы хоць бы дрэвы пасадзілі там, дзе іх у свой час спілавалі і знішчылі»***, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

## Не дзеля піяру, але памяці

Асаблівы для ўсіх, у тым ліку і прафсаюзаў бягучы год, калі будзем святкаваць 75-ы юбілей Вялікай Перамогі.

Прэзідэнт падзяліўся: яго расійскі калега хваліў беларусаў за захаванне шматлікіх, нават самых маленькіх помнікаў.

Захаванне памяці аб ваенным ліхалецці — справа і прафсаюзаў. Пры ўдзеле іх актыву праведзена маштабная рэканструкцыя Кургана Славы, пастаянна абнаўляецца экспазіцыя ваеннай тэхнікі. Летам яна папоўнілася легендарным штурмавіком Іл-2. Сёлета будзе ўстаноўлена легендарная «Кацюша».

«Позна вяртаюся з камандзіровак, звычайна ноччу прылятаю, гляджу. Ці ты спецыяльна ўключаеш усю гэту падсветку? — жартам звярнуўся да Міхаіла Орды кіраўнік краіны. — І радуюся, няхай глядзяць, як мы адносімся да той памяці, да гераізму ўсіх людзей. Гэта не толькі да Кургана Славы, да гэтага велічнага помніка, гэта да ўсіх помнікаў. ***Людзі, якія падаравалі нам сённяшняе жыццё, заслужылі гэтай памяці»***.

Па словах лідара краіны, заслугоўвае вялікай павагі тое, што ўся праца не дзеля піяру, а дзеля высакароднай мэты.

## Пад новым сцягам

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўся дзейнасць прафсаюзаў адлюстроўвае эвалюцыйны шлях працоўнага руху.

«Я хацеў бы пажадаць Федэрацыі новых прафесійных дасягненняў, усім дэлегатам і гасцям з'езду — эфектыўнай працы на карысць нашай роднай Беларусі. І ў знак павагі нашага народа да вас і майго, як кіраўніка дзяржавы, я прыняў рашэнне, што наша прафсаюзная арганізацыя мусіць атрымаць новы дзяржаўны сцяг, і дазвольце мне сёння яго ўручыць», — звярнуўся да ўдзельнікаў з'езду Прэзідэнт.

Ганаровы дзяржаўны сцяг Беларусі прысуджаны Федэрацыі за асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-эканамічным развіцці, абароне правоў і інтарэсаў працоўных.

Дэлегаты з'езду падрыхтавалі Аляксандру Лукашэнку падарунак — карціну, выкананую ў тэхніцы валянай воўны, з выявай школы, у якой вучыўся Прэзідэнт.

**Фота БелТА.**

## «Ураўнілаўка» ў пенсіях недапушчальная



Пенсійнае забеспячэнне, цэны на сацыяльна значныя тавары і ад'езды высокакваліфікаваных спецыялістаў за мяжу — тэмы выступлення **старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Міхаіла ОРДЫ** на VIII з'ездзе.

Сёння прафсаюзы наўпрост удзельнічаюць у прыняцці самых важных рашэнняў у сацыяльна-эканамічнай сферы. Усе праекты дакументаў, якія датычацца працоўных правоў, накіроўваюцца на экспертызу ў Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі. Так, летась ФПБ упершыню выступіла адным з распрацоўшчыкаў праекта закона аб змяненні Працоўнага кодэкса, унёсшы каля 40 прапаноў.

Важнае пытанне, якое ўзнімаюць працоўныя Беларусі, — пенсійная сістэма. Сёння дзейнічае ўраўняльны прынцып: практычна аднолькавую пенсію атрымліваюць матываваныя супрацоўнікі і тыя, хто «спаў» на працы. Міхаіл Орда лічыць такі падыход няправільным і несправядлівым. Механізмы налічэння пенсій мусяць зацікавіць людзей працаваць лепш, удасканальваць у прафесіі.

Адзначыў старшыня ФПБ і пэўны дысбаланс у налічэнні пенсій тым, хто працягвае працаваць. Закрануў Міхаіл Орда і актуальнае пытанне сёлетняга змянення сістэмы аплаты працы «бюджэтнікаў». Гэтай тэме прысвечана спецыяльная «гарачая лінія» ФПБ, на якую паступіла больш за 400 званкоў. Выяўленыя памылкі выпраўляюцца дзень у дзень.

Старшыня Федэрацыі нагадаў, што генеральнае пагадненне паміж урадам, саюзамі наймальнікаў і прафсаюзамі прадугледжвае зарплату бюджэтнікаў не менш за 80 працэнтаў ад сярэдняй па краіне. У цэлым гэтае патрабаванне выконваецца, аднак застаюцца сферы, дзе лічбы не дацягваюць да мэтавых (напрыклад, культура), таму прафсаюзы звяртаюцца да ўрада з просьбай разгледзець магчымыя шляхі павышэння аплаты працы ў такіх сферах.

Міхаіл Орда папрасіў падтрымкі Прэзідэнта ў пытанні распрацоўкі канцэпцыі страхавання ад нявыплаты зарплаты працаўнікам пры банкруцтве арганізацыі.

## Стаўка=БПМ



Базавую стаўку, якая з 1 студзеня выкарыстоўваецца для разлікаў аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый, прапануецца ўзняць да ўзроўню бюджэту пражытковага мінімуму.

Такую прапанову агучыла на з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі **Таццяна ЯКУБОВІЧ, старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.** На яе думку, базавая стаўка, якая цяпер існуе (185 рублёў), не вырашае праблему выплаты мінімальнага заробку.

«Мы бачым і праблему работнікаў арганізацый, якія раней мелі ведамаснае падпарадкаванне, а потым перайшлі ў сістэму Мінадукацыі, — паведаміла лідар прафсаюзнай арганізацыі. — У асноўным гэта работнікі дзіцячых садкоў. Ім не залічваюцца ў стаж працы ў бюджэтнай арганізацыі дадзеныя перыяды, хоць фактычна яны шмат гадоў адпрацавалі менавіта ў гэтай сферы».

Акрамя таго, дадатковай прапрацоўкі патрабуе пытанне налічэння зарплаты кіраўнікам устаноў адукацыі і іх намеснікам, якія маюць вучэбную нагрузку па сумяшчальніцтве. «Надбаўка за спецыфіку працы ім устаноўлена ў памеры трыццаці працэнтаў, як настаўнікам без катэгорыі. А гэта нашы найлепшыя кадры, было б правільна налічыць ім павышэнне хоць бы да ўзроўню першай катэгорыі», — лічыць дэлегат.

Старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі таксама звярнула ўвагу на неабходнасць выключыць сітуацыі, калі сродкі, выдзеленыя на аплату працы работнікаў адукацыі і іншых бюджэтных сфер, часткова пераразмяркоўваюцца на іншыя патрэбы горада або раёна.

## Задачы агульныя



***Алена ПАТАПАВА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў,*** на працягу трынаццаці гадоў была старшынёй першаснай прафсаюзнай арганізацыі «ЗОВ». За гэтыя гады з дапамогай калектыўнага дагавора ўдалося аб'яднаць работнікаў больш чым 20 прадпрыемстваў, звязаных паміж сабой эканамічна.

«У перыяд станаўлення нам даводзілася даказваць слушнасць прафсаюзнай ідэі і работнікам, і прадстаўнікам наймальніка. А ўлічваючы, што прадпрыемства на 100 працэнтаў прыватнае, на практыцы гэта было няпроста. Але ў нас атрымалася! І прафсаюзная арганізацыя, якая першапачаткова складалася толькі з дзевяці чалавек, уключаючы дырэктара, сёння аб'ядноўвае каля 1400 членаў прафсаюза. Гэта больш за 90 працэнтаў усіх работнікаў», — расказала дэпутат.

Прафсаюз прымаў удзел у вырашэнні пытанняў аховы працы, заработнай платы і прэміравання, пашырэння сацыяльнага пакета работнікаў. Сёння работнікі прадпрыемства абаронены калектыўнай дамовай, якая змяшчае дадатковае медыцынскае страхаванне і шэраг іншых гарантый, што фарміруюць значны сацыяльны пакет для членаў прафсаюза, арганізавана перанавучанне работнікаў, працуе вучэбны цэнтр.

**Варвара МАРОЗАВА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Марыя ДАДАЛКА.**

На слыху

# НЕ АБЫШЛОСЯ...

## У Беларусі зарэгістраваны першы выпадак каранавіруса

**У студэнта з Ірана 27 лютага тэсты, праведзеныя ў сталічным РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, паказалі наяўнасць віруса 2019-nCoV, паведаміла ўчора прэс-служба Міністэрства аховы здароўя. Яшчэ 22 лютага ён рэйсам з Баку прыбыў у Мінск. Людзі, якія жылі на кватэры разам з захварэлым, таксама шпіталізаваны ў Мінскую інфекцыйную бальніцу. Сама медустанова з раніцы 28 лютага закрыта на каранцін. Заняткі ў БНТУ адменены да 15 сакавіка.**

Нягледзячы на тое, што заняткі ў аўдыторыях у БНТУ ўжо з пятніцы вырашана не праводзіць, і ў саміх будынках, і побач з імі ў гэты дзень назіраецца вялікая колькасць студэнтаў. Раніцай, калі яны прыйшлі на заняткі, рашэнне аб адмене яшчэ было невядома. У падземным пераходзе побач з галоўным корпусам БНТУ прадавец шавермы доўга размаўляе па мабільным тэлефоне, потым выбачаецца: «Мама з-за мяжы тэлефануе, перажывае, прачытала, што ў Беларусі каранавірус. А я спачатку здзіўляўся, чаму гэта ў мяне сёння зацішша — няма пакупнікоў». Студэнтам у гэты дзень сапраўды не да перакусаў. Зусім побач з галоўным корпусам БНТУ знаходзіцца інтэрнат № 3. Як стала вядома, студэнт з Ірана, у якога дыягнаставалі каранавірус, наведваў яго да таго, як у яго ўзялі аналіз. Некалькі студэнтаў адтуль таксама цяпер пад медыцынскім наглядам.

Як выявілі хворага студэнта з Ірана, які вучыцца на перадапошнім курсе механіка-тэхналагічнага факультэта БНТУ, расказаў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК:**

— Мы пастаянна абнаўляем пералік краін з неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкай. І з 26 лютага ў Іране фіксаваўся рэзкі рост колькасці захварэлых. Такім чынам, Іран быў унесены ў пералік краін з неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкай. Было дадзена ўказанне правесці выяўленне і абследаванне грамадзян гэтай краіны, якія ўехалі ў Беларусь пасля 20 лютага. Адзін са студэнтаў, які 20 лютага на маршрутным таксі прыехаў у Баку, а 22-га прыляцеў адтуль у Беларусь, быў выкліканы ў 33-ю мінскую паліклініку. На момант агляду ў яго не было скаргаў, але медработніка насцярожыла невялікая тэмпература — 37,3 і пачырваненне ў горле. Ён быў дастаўлены ў інфекцыйную бальніцу, дзе ў яго ўзялі мазкі. Аналіз пацвердзіў наяўнасць узбуджальніка з сямейства каранавірусаў. Цяпер мы высвятляем, наколькі гэта эпідэміялагічна важны штам, адразу інфармуем пра гэта грамадскасць і Сусветную арганізацыю аховы здароўя. Акрамя таго, студэнты, якія пражывалі сумесна з гэтым грамадзянінам (а ён жыў на кватэры) шпіталізаваны для медыцынскага назірання. Стан маладога чалавека здавальняючы, тэмпература ў яго не паднімалася вышэй за 37,4, праводзіцца медыцынскае назіранне.

Улічваючы той факт, што 22 лютага Іран яшчэ не быў унесены ў лік эпідэміялагічна небяспечных краін, іранец прайшоў стандартныя меры кантролю, у тым ліку праверку цеплавізарам. Прыкмет хваробы на той час у яго не было, адзначыў Уладзімір Каранік. Да таго ж у студэнта няма кашлю (і гэта суцяшальны факт), бо менавіта пры ім адбываецца найбольшае распаўсюджанне інфекцыі.

Тым не менш, паведаміў міністр, студэнты, якія вучыліся разам з хворым, а таксама медработнікі, якія кантактавалі з ім, пераведзены пад медыцынскае назіранне. БНТУ, дзе вучыцца студэнт, пераводзіцца на індывідуальную праграму навучання. У прыватнасці, як паведамляе прэс-служба ўніверсітэта, заняткі адменены да 15 сакавіка.

— Мы размяркоўваем патокі студэнтаў, уся ВНУ пераводзіцца на індывідуальную праграму. Паколькі іранскі студэнт не сам звярнуўся ў паліклініку, а быў выкліканы па прызначаны час, ён не сядзеў у чарзе і не кантактаваў з вялікай колькасцю асоб. Медработнік, які яго прымаў, і брыгада хуткай дапамогі, якая дастаўляла яго ў інфекцыйную бальніцу, таксама ўзяты пад медыцынскае назіранне, — падкрэсліў міністр.

Уладзімір Каранік нагадаў, што з сямейства каранавірусаў вядомы вірус Sars, які выклікаў успышку атыпічнай пнеўманіі, лятальнасць якой складала да 10 %, а таксама Mers, аравійскі каранавірус, дзе лятальнасць была яшчэ больш, да 30 %. Цяперашні COVID-19 з усёй групы каранавірусаў найменш смяротнасны, але найбольш эпідэміялагічна актыўны — ён хутчэй распаўсюджваецца.

З 9 гадзін раніцы 28 лютага Мінская гарадская клінічная інфекцыйная бальніца, куды ў ізаляваныя боксы дастаўлены шпіталізаваныя, закрыта на каранцін. Уваход на яе тэрыторыю забаронены. Не вядзецца планавы кансультатыўны прыём пацыентаў, акрамя пацыентаў дыспансернага аддзялення па ВІЧ і дыспансернага кабінета па гепатытах, якія маюць неабходнасць у выдачы лекавых сродкаў для працягу лячэння, папярэджвае сайт установы.

— На сёння эпідэміялагічная сітуацыя цалкам кантралюемая. Нагоды для закрыцця граніц няма, — адзначыў Уладзімір Каранік. — Трэба разумець, што мы жывём у адкрытым свеце, закрыць межы ў прынцыпе немагчыма. Дастаткова паглядзець у інтэрнэце flightradar, і вы ўбачыце колькі самалётаў знаходзіцца ў гэты момант над Еўропай і як перамяшчаецца насельніцтва. Наша задача — забяспечыць кантроль на знешнім контуры краіны з усімі, хто ўязджае. Згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, граніцы не рэкамендуецца закрываць з шэрагу прычын. Гэта будзе стымуляваць незаконную і бескантрольную міграцыю, калі людзі ўсё роўна, калі ім трэба, уедуць у краіну, але мінуючы нашы пункты пропуску. І калі яны нелегальна ўехалі, то будуць баяцца звяртацца ў медустановы. Гэта можа прывесці да некантралюемага распаўсюджання інфекцыі.

**Алена КРАВЕЦ.**

### ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ВІРУСА

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя сярод мер, якія дапамогуць засцерагчыся ад вірУснай інфекцыі, называе частае мыццё рук і выкананне правіл рэспіраторнай гігіены падчас чхання і кашлю. Сачыць за чысцінёй рук важна, бо калі на іх паверхні ёсць вірус, мыццё з мылам знішчыць яго. Мыць рукі з мылам абавязкова! Працэдура павінна займаць не менш за 20 секунд. Мыць варта не толькі ўнутраны, але і вонкавы бок кісцяў, а таксама прамежкі паміж пальцамі. Пасля іх трэба выцерці рушніком, у грамадскіх месцах — папяровым, і закрыць ім кран, не дакранаючыся да яго чыстымі рукамі. Пры адсутнасці магчымасці памыць рукі апрацоўвайце іх спіртаўтрымліваючымі вадкасцямі.**

**Калі пры кашлі ці чханні прыкрываць рот далонню, як мы звычайна гэта робім, мікробы патрапяць на вашы рукі, а з іх — на ўсё, да чаго вы дакранаецеся. Таму пры кашлі і чханні рэкамендуецца прыкрываць рот папяровай сурвэткай ці згібам локця. Калі кашляе нехта іншы, трымайцеся ад яго на адлегласці, як мінімум у метры.**

### Шпіталізавана 28 асоб, якія кантактавалі з хворым

**Каля 28 асоб было шпіталізавана і змешчана пад медыцынскае назіранне ў сувязі з выяўленнем першага завазнога выпадку каранавіруса ў Беларусь. Гэта аднагрупнікі і выкладчыкі студэнта з Ірана, у якога была выяўлена хвароба, пасажыры і частка экіпажу, разам з якімі ён прыляцеў у нашу краіну, а таксама дзяўчына студэнта і яе сям'я, з якімі кантактаваў хворы. Пра гэта ўчора ўвечары паведаміў міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.**

Аналізы былі зроблены, але пакуль заражэння ні ў кога са шпіталізаваных не было выяўлена.

— Дадзеныя лабараторных абследаванняў паказалі наяўнасць у іранскага студэнта фрагмента РНК каранавіруса. Гэта можа азначаць як стадыю носьбіцтва, так і тое, што пацыент перанёс захворванне ў сябе на радзіме ў лёгкай форме, — адзначыў Уладзімір Каранік.

**Прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Батыр БЕРДЫКЛЫЧАЎ** адзначыў: што ў Беларусі выяўлены выпадак каранавіруса не з'яўляецца сюрпрызам, бо вірус не ведае межаў. Пытанне ў тым, наколькі да гэтага краіна гатова.

— Мы ўбачылі гатоўнасць Беларусі: грамадскасці аб'яўлена аб выяўленні віруса, пацыент шпіталізаваны. Вельмі важна, што краіна прымае ўсе меры, — адзначыў Батыр Бердыклычаў.

Прадстаўнік САЗ праінфармаваў, што на 28 лютага вірус зафіксаваны ў 52 краінах свету. Занепакоенасць выклікае яго хуткае распаўсюджанне ў Італіі, Паўднёвай Карэі і Іране.

— У 81 % выпадкаў каранавірус працякае ў лёгкай і сярэдняй форме, у 14 % — у больш сур'ёзнай форме і толькі 5 % выпадкаў могуць прыводзіць да смерці, — адзначыў Батыр Бердыклычаў.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кошт барэля нафты абваліўся ніжэй за 50 долараў



Цэны на «чорнае золата» эталонных марак у ходзе пятнічных таргоў адчувальна зменшыліся з-за панічных настрояў на рынках з нагоды дынамікі распаўсюджвання кітайскага каранавіруса. Майскія ф'ючарсы на паўночнаморскую нафтавую сумесь Brent патаннелі на 3,5 працэнта да папярэдняга закрыцця — да $49,93 за барэль. Гэта адбылося упершыню са снежня 2018 года, паведамляе «Інтэрфакс». Больш за тое, на мінімуме ў ходзе сесіі Brent тэставала адзнаку ў $49,56 — на такім узроўні нафта гандлявалася 25 ліпеня 2017 года, удакладняе РБК. Тым часам красавіцкія ф'ючарсы на заходнетэхаскі гатунак WTI ўпалі на 4 % — да $45,22 за барэль. Зніжэнне адбываецца шостыя таргі запар. Падзенне з пачатку гэтага тыдня перавышае 14 працэнтаў і з'яўляецца максімальным з 2011 года.

### Лондан — з новым ультыматумам Бруселю



Мяркуецца, што калі на працягу чатырох бліжэйшых месяцаў партнёрам не ўдасца вызначыць хоць бы «агульныя рысы» пагаднення аб адносінах пасля брэксіта, то брытанцы пакінуць стол перагавораў. Іх актыўная фаза стартуе ўжо ў пачатку сакавіка. Абодва бакі выступаюць за стварэнне зоны свабоднага гандлю, але не могуць дамовіцца ні пра тое, як будзе ажыццяўляцца кантроль унутры яе, ні пра тое, якім чынам забяспечыць умовы для сумленнай канкурэнцыі бізнесу. Па словах галоўнага перагаворшчыка ЕС Мішэля Барньe, заключэнне гандлёвага пагаднення залежыць ад таго, ці ўдасца Бруселю і Лондану знайсці паразуменне па пытанні рыбнай лоўлі. Вялікабрытанія і Еўрасаюз маюць намер таксама абмеркаваць партнёрства ў галіне экалогіі, інтэлектуальнай уласнасці, дзяржзакупак, транспарту і энергетыкі.

### Зафіксаваны наймагутнейшы выбух у Сусвеце



Астраномы зафіксавалі самую магутную ўспышку энергіі ў Сусвеце з часоў Вялікага выбуху. Некаторыя спецыялісты параўноўваюць гэтае адкрыццё па значнасці з выяўленнем першых касмічных хваляў. Выбух адбыўся каля звышмасіўнай чорнай дзіркі ў цэнтры галактыкі, аддаленай ад Зямлі на 390 мільёнаў светлавых гадоў, якая знаходзіцца ў скапленні Змеяносца. Выкід энергіі быў такі моцны, што прабіў гіганцкі пралом у навакольнай плазме. У гэтую параджніну маглі б змясціцца 15 галактык кшталту Млечнага Шляху. Даследчыкам пакуль невядомая прычына такога моцнага выбуху. У будучым плануецца правесці больш дакладныя назіранні.

Ініцыятывы

## Каб беларуская мова часцей «гучала» ў сецiве

**У байнэце стартуе маштабная праграма па падтрымцы беларускай мовы. Рэалізуе ініцыятыву хостынг-правайдар HostFly.by, які аказвае паслугі па рэгістрацыі даменных імёнаў і размяшчэнні інтэрнэт-рэсурсаў у сецiве.**

Чакаецца, што ўсе аўтарскія рэсурсы, якія публікуюць матэрыялы на роднай мове, атрымаюць эксклюзіўныя ўмовы размяшчэння ў сецiве з выкарыстаннем сучасных воблачных тэхналогій.

— Мы гатовы падтрымаць аўтарскія праекты, якія выкарыстоўваюць беларускую мову для трансляцыі поглядаў, меркаванняў або ілюстрацыі падзей, што адбываюцца ў краіне. На падтрымку могуць разлічваць як цалкам беларускамоўныя, так і рэсурсы, якія публікуюць матэрыялы на рускай і беларускай мовах, — пракаментаваў падзею кіраўнік праекта HostFly.by Аляксандр ХМЫЛЬ.

Каб падтрымаць беларускамоўныя рэсурсы, HostFly.by гатовы даць эксклюзіўныя ўмовы размяшчэння на воблачным хостынгу. Кіраўнік HostFly.by падкрэсліў, што беларуская мова дапамагае многім праектам у байнэце захаваць нацыянальную адметнасць, таму іх трэба падтрымліваць і стымуляваць з'яўленне новых інтэрнэт-старонак.

Узяць удзел у праграме змогуць праекты, размешчаныя ў даменных зонах .бел і .by. Галоўная ўмова — наяўнасць аўтарскіх матэрыялаў на беларускай мове. Заяўку на ўдзел у праграме і размяшчэнне на хостынгу HostFly.by можна даслаць на адрас: bel@hostfly.by.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЗАГАЎЛІНЫ ПЕРАД ПАПЯЛЬЦОМ



У вёсках на Ашмяншчыне перад каталіцкім Велікодным постам спрадвеку адзначалі загаўліны — вясёлае застолле-ігрышча. Праводзілася яно ў «тлусты аўторак» надвячоркам за апетытнымі стравамі з гармонікам і бубнам, з песнямі і танцамі. Назаўтра, у сераду, людзі ішлі ў касцёл і пасыпалі галовы попелам, пачынаўся пост. Нездарма казалі: загаўліны перад Папяльцом. У вёсцы Кальчуны пяты год запар, з нагоды «запустаў» Цэнтр культуры і вольнага часу наладжвае народнае свята. Гэтым разам работнікі ўстановы і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці пранеслі па вёсцы, развітваючыся з зімою, — саламянае пудзіла, палілі вогнішча, у якое кідалі старыя рэчы. Гасцей сустракалі гарачымі блінамі і песнямі. У клубным памяшканні правялі інтэрактыўны спектакль пад назвай «прабачальная бяседа». Тут можна было ўбачыць, як хлопцам прывязвалі «калоды», каб жаніліся, паслухаць дзяўчат-весялушак, як яны адна перад адной ліха сыпалі прыпеўкамі. Мясцовыя артысты з гуртоў «Скарбніца» і «Вечарынка», «Жытніца» і «Валычанка» далучалі гледачоў да песеннага скарбу. А «разынкай» бяседы стала рытуальнае накрыванне хлеба і напояў дамотканым ручніком і кажухом — гэта старажытны звычай-абярэг, каб не зводзіўся род, каб былі дабрабыт і шчасце.

Калісьці прабачальныя «загаўліны» таленавітыя жыхаркі з Кальчуноў паказвалі па беларускім тэлебачанні ў праграме «Вячоркі». Цяпер гэты вясковы звычай стаў брэндам усяго раёна.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

***Больш здымкаў з кальчуноўскіх загаўлін глядзіце на нашым сайце.***







# ПОКЛІЧ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У гаспадара ж работы хапае ў любую пару. Бацькоўскую хату адрамантаваў і добраўпарадкаваў. Акрамя агарода займаецца пчоламі. У двары маю ўвагу прыцягнуў незвычайны, даволі прасторны, двухпавярховы будынак. Яго гаспадар узвёў з... колатых дроў. Ніколі не бачыла дроў у якасці будаўнічага матэрыялу. Ён заўсміхаўся, сказаў, што спачатку задумаў навес для машыны. Потым прыйшло ў галаву зрабіць лёгкія сцены. Вось і выкарыстаў дровы, папярэдне замацаваўшы растворам. Такім чынам атрымаўся крэатыўны гараж з лазняй, прасторным падсобным памяшканнем, а на другім паверсе размясцілася майстэрня. У двары, варта дадаць, усё абстаўлена з акцэнтам на прыроду і натуральнасць.

— Што б я рабіў у горадзе? — разважае гаспадар сядзібы, — на лаўцы сядзець пад пад'ездам — агорне сум, туга, роспач, за год згаснеш. А тут, бачыце, прасторы якія, паветра!

І праўда, Акольнік шмат у чым асаблівы, уражвае размах гаспадароў, былых і цяперашніх. Людзі будаваліся не побач адзін з адным, а на адлегласці. У кожнага сядзіба з вялікім дваром, такім жа садам, што сведчыла пра пэўную ступень заможнасці. Такім чынам вёска нібы старалася адпавядаць пушчы, яе прасторам, маштабам. Такія ж і людзі ў ёй жылі. Напрыклад, Аляксандр Жэдзь, бацька нашага героя, які памёр ва ўзросце 98 гадоў.

У Валерыя Жэдзя з'явілася жаданне сабраць гісторыю сваёй мясціны і напісаць пра яе, бо бацькі і аднавяскоўцы колькі нацярпеліся за сваё жыццё. Ну хоць бы той жа Аляксандр Жэдзь: пры Польшчы яго, камсамольца-падпольшчыка, расстрэльвалі, нейкім цудам застаўся жывы. З вайны прыйшоў у 1945-м кавалерам ордэна Славы. А ў 48-м толькі паставіў свой дом, як атрымаў 25 гадоў лагераў разам з трыма аднавяскоўцамі па абсурдным даносе. Пасля 53-га справу вяскоўцаў перагледзалі, у 55-м адпусцілі і жыхароў Акольніка. Моцныя духам людзі пушчы ўсё вытрымалі, многа працавалі, як правіла, жылі доўга.

— Яшчэ і таму не хочацца пакідаць сваю хату на павольнае паміранне, а вёску на хутчэйшае згасанне, — прызнаўся нашчадак былога гаспадара. Ды і не так тут сумна, як можа падацца на першы погляд, пошта прыязджае, аўтакрама, для сувязі з усім светам ёсць тэлефон і хуткасны інтэрнэт.



Мікалай і Ірына ХЯВУКІ.

## Стараста вёскі

Былы начальнік упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама Мікалай Хявук цяпер паўнапраўны жыхар Лешніцы Маларыцкага раёна. Чвэрць стагоддзя адпрацаваў у спартыўнай галіне рэгіёна. Цяпер жа — вясковы жыхар.

— Спачатку, вядома, заняўся рамонтам і рэканструкцыяй дома, тады якраз праводзілі газ. Ну а потым і падворак трэба было ў парадак прыводзіць. Вось што атрымалася за гэтыя гады, — паказвае рукой суразмоўнік.

Атрымалася ж сапраўды прыгожа, нават з пэўным размахам. Вакол дарожак роўнымі радамі растуць высокія туі, на клумбах — вялікая колькасць кветак, якія цвітуць ад ранняй вясны да позняй восені.

Далей, у глыб двара, дарожка прыводзіць да невялічкага вадаёма, выкладзенага каменьчыкамі. А збоку разгарнулася экспазіцыя пад адкрытым небам: драўляны воз, сячкарня, конная сеялка. Аказваецца, Мікалай Мікалаевіч даўно збіраў рарытэтныя рэчы. Цяпер яны ўтвараюць этнаграфічны куток у двары. А іншыя, напрыклад, вугальныя прасы, самаробныя замкі, ліхтары, газавыя лямпы — аздабляюць невялікі хатні музей, афармлены на мансардным паверсе. Гэты музей асаблівы, яго асноўная экспазіцыя прысвечаная спартыўнаму жыццю Брэстчыны. У якасці экспанатаў пераважаюць здымкі розных падзей ды герояў тых дзён, спартсменаў.

Адну са сцен музея ўпрыгожвае адмысловая калекцыя гальштукаў гаспадара — іх тут 123 штукі, сведчанне чыноўніцкага мінулага і модных тэндэнцый былых гадоў. Гальштукі аднатонныя і стракатыя розных колераў і краін выглядаюць даволі цікава.

Гэта — што датычыцца формы новага існавання сям'і Хявукоў. А яго змест — сялянская праца. Гектар зямлі — вам не жартачкі. Работы хапае на градках, у садзе, нядаўна, расказваюць, і курачак завялі. Так што на сваім участку занятак абаім знаходзіцца з ранку да вечара.

Варта яшчэ сказаць, што некалькі гадоў таму Мікалая Мікалаевіча абралі старастам вёскі. У Лешніцы цяпер 28 жыхароў, большасць — пажылыя. Самыя сталыя ведаюць старасту з дзяцінства і дагэтуль называюць Колькам. «Галоўнае, каб своечасова прыязджалі ўсе службы: пошта, аўтакрама, медыцынская дапамога, — разважае стараста. — З гэтым праблем няма, хуткая дапамога, калі выклікаюць, прыязджае сапраўды хутка. Дарогу вось нядаўна па вуліцы Суворава адрамантавалі». Артысты ў вёсцы бываюць, гэта ўжо стараста паспрыяў, дамовіўся з сельвыканкамам, аддзелам культуры, каб на святы прыязджалі ўдзельнікі самадзейнасці, арганізоўвалі канцэрты.

З рознымі пытаннямі прыходзяць суседзі да старасты, яго задача звязацца з сельвыканкамам, праінфармаваць мясцовую ўладу. Ну і, вядома, важны асабісты прыклад. Людзі яшчэ таму абралі старастам наваспечанага вяскоўца, што яго дом, падворак, агарод — узорна-паказальныя, хоць семінары праводзь, вопыт вывучай.

Ну а душой усёй гэтай прыгажосці, яе стваральніцай і захавальніцай, вядома, з'яўляецца гаспадыня — Ірына Піліпаўна.

Колькі ў каморы розных варэнняў-саленняў, зробленых па вытанчаных рэцэптах, як адмысловых бабуліных, так і навамодных з інтэрнэту! Нас са старшынёй сельвыканкама яна частавала вяленымі памідорамі па-італьянску і агурочкамі, марынаванымі з гарчыцай, а таксама сваімі фірмовымі грыбамі — пальчыкі абліжаш. Аказваецца, Ірына Піліпаўна заядлая грыбніца. А чарніц, расказвала, летась сабрала сем вёдзер. Гарбузы ж вырасціла такія, што найвялікшы важыў 58 кілаграмаў. Здзіўляюся, як пры такой хатняй гаспадарцы паспявае ў лес хадзіць, збіраць яго дары. Смяецца: «Нібы другое дыханне адкрылася, кожны дзень у лес як на работу бягу, усе хваробы праходзяць». Вось так былы прафесійны прафсаюзны работнік Ірына Хявук знайшла сябе ў ролі гаспадыні вялікай сядзібы.

## Час вырошчваць капусту

Цяпер ледзь не ў кожнай вёсцы можна сустрэць былых гараджан. Яны ў свой час адвучыліся, адпрацавалі ў вялікіх і малых гарадах, а пасля выхаду на пенсію прывялі ў парадак бацькоўскія хаты, пераехалі туды на пастаяннае жыхарства. І ўсё часцей у якасці новых вяскоўцаў сустракаюцца людзі адукаваныя, былыя кіраўнікі і спецыялісты. У многіх раней не было магчымасці, часу нешта ствараць уласнымі рукамі, а тут адкрылася прастора для дзейнасці, як у тага рымскага імператара Дыяклетыяна. Памятаеце, ён добраахвотна адышоў ад спраў і стаў вырошчваць капусту.

Зноў жа, калі раней чалавек актыўна і шмат працаваў, быў у гушчы жыцця, а потым аказаўся нібы на ўзбочыне, гэта можа стаць нават нагодай для дэпрэсіі, а жывучы ў вёсцы, проста няма часу думаць — работы хапае. Пры тым фізічныя нагрузкі, рухальная актыўнасць на свежым паветры вельмі карысныя — такім чынам арганізм нібы атрымлівае кампенсацыю за многія гады кабінетнай работы. Магчымасці ж для чытання або інтэлектуальных практыкаванняў з наяўнасцю інтэрнэта неабмежаваныя. А вось прасторы большыя. Хто б дазволіў сабе адвесці цэлы пакой для экспанатаў ва ўласнай трохпакаёвай кватэры? А тут — калі ласка. Музей Мікалая Хявука запатрабаваны, яго паказваюць гасцям, часам тут збіраюцца былыя калегі, таварышы, гуляюць у більярд, разглядаюць здымкі, успамінаюць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Пружанскі, Маларыцкі раёны.*

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Авто от Мастеркард. Март»

**1. Организатор Рекламной игры**

Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс» (далее – Организатор), УНП 100843219, адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является: общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Заинтересованное лицо).

**2. Наименование и территория проведения Рекламной игры**

Рекламная игра носит название «Авто от Мастеркард. Март» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

**3. Срок начала и окончания Игры**

Игра проводится с 1 марта 2020 г. по 6 мая 2020 г. (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

**4. Комиссия по проведению Игры**

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

Лукашевич Ольга Леонидовна – индивидуальный предприниматель – управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс» – председатель комиссии;

Стельмах Александр Петрович – заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама»;

Василькова Елена Александровна – ведущий специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

Садовская Диана Сергеевна – специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

Расько Екатерина Александровна – экономист по договорной работе ООО «Сэлмон Медиа».

**5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра**

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard (далее – Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, для оплаты топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

**6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Игры**

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, являющиеся держателями действующей банковской карты Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro с учетом ограничений, указанных в данных правилах (далее – Участник Игры).

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

в период с 1 марта 2020 г. по 31 марта 2020 г. включительно совершить покупку топлива по собственной Карте Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 0,60 белорусского рубля (шестьдесят копеек) одним чеком с использованием собственной зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты (в дальнейшем – Карта Белоруснефть), которая определяет физическое лицо как участника программы лояльности клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

Зарегистрированной считается Карта «Белоруснефть» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих достоверных данных: фамилии, имени, отчества, даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, а также адреса электронной почты.

6.4. Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.

**7. Состав и размер призового фонда и источники его формирования**

Размер призового фонда игры составляет **36 617,01** (тридцать шесть тысяч шестьсот семнадцать) белорусских рублей 01 копейка. Состав призового фонда:

| Наименование | Количество, шт. | Стоимость за единицу, бел. руб. | Общая стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Автомобиль: КИА RIO_FB<br>Год выпуска: 2019<br>Цвет кузова: красный<br>Номер кузова:<br>Z94C251BBLR077706 | 1 | 31 875,00 | 36 617,01 |
| И денежные средства для уплаты налога в размере **4 742,01** бел. руб. | 1 | 4 742,01 | |

Источником формирования призового фонда Игры являются денежные средства Заинтересованного лица – ООО «Рефорте».

**8. Проведение розыгрыша призового фонда**

**8.1. Место, дата и время проведения розыгрыша**

Розыгрыш призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 143 (АЗС 23 ПО «Белоруснефть»).

Дата и время проведения розыгрыша: 13 апреля 2020 г. в 19.05.

8.2. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей

8.2.1. Для розыгрыша в установленном порядке формируется список участников (далее – Список) с указанием даты первой транзакции, соответствующей условиям рекламной игры, присвоенного номера Шанса, номера карты, фамилии, имени, отчества участника, даты рождения, электронного адреса, телефона, населенного пункта и области.

Каждому Участнику игры, выполнившему условия, указанные в подпункте 6.3 данных правил, присваивается номер Шанса по номеру Карты «Белоруснефть» в порядке возрастания. Все номера Шансов имеют одинаковую разрядность.

8.2.2. Для проведения розыгрыша используются специальный вращающийся непрозрачный барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера Шанса происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера Шанса в барабан помещаются шары с номерами от «0» до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего порядкового номера Шанса из Списка. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Далее для определения цифры в следующем разряде формируемого выигрышного номера Шанса в барабан загружаются шары с номерами, которые существуют в соответствующем разряде номеров Шансов в Списке. Шары перемешиваются, и из барабана извлекается один шар. Номер шара вносится в протокол и записывается в соответствующий разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Определение 2 (двух) альтернативных выигрышных номеров Шансов (Альтернативного победителя № 1 и Альтернативного победителя № 2) происходит следующим образом: Альтернативным победителем № 1 становится Участник Игры с номером Шанса через 6000 номеров от победившего номера Шанса, Альтернативным победителем № 2 становится Участник Игры с номером Шанса через 12 000 номеров от победившего номера Шанса.

В случае если выпавший номер Шанса находится в конце Списка, то исчисление для определения Альтернативных победителей продолжается с начала Списка.

8.2.3. При проведении розыгрыша Комиссией оформляется протокол розыгрыша.

8.2.4. Участники Игры вправе присутствовать при проведении розыгрыша.

**9. Срок и способ информирования победителя, место, порядок и срок выдачи выигрыша**

9.1. После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителя о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 15 апреля 2020 г. включительно.

9.2. Для получения приза победителю необходимо в срок до 17 апреля 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by следующие данные:

9.2.1. для граждан Республики Беларусь, а также иностранных граждан и лиц без гражданства, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь:

- копию страницы 25, страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

- копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

9.2.2. для иностранных граждан и лиц без гражданства, не имеющих вида на жительство:

- копию паспорта страны, гражданином которой он является (для лиц без гражданства – документ, подтверждающий их личность, выданный в порядке законодательства страны фактического проживания). В случае если данный документ выдан не на государственном языке Республики Беларусь, также заверенный нотариально перевод такого документа на государственный язык Республики Беларусь.

9.3. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, пр. Независимости, 200 в срок до 21 апреля 2020 г. включительно. Победитель предварительно согласовывает дату и время прибытия за получением приза с Организатором по телефону +375 17 216-80-77.

9.4. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с победителем любым из указанных выше способов, либо победитель не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо победитель отказывается от приза, либо победитель не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза Победителю в связи с нарушением правил Игры, право на приз переходит Альтернативному победителю № 1.

9.5. Альтернативный победитель № 1 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS до 22 апреля 2020 г. включительно. Для получения приза альтернативный победитель, которому перешло право на получение приза, должен до 24 апреля 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2 правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, пр-т Независимости, 200 в срок до 29 апреля 2020 г. включительно.

9.6. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с Альтернативным победителем № 1 любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 1 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо Альтернативный победитель № 1 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 1 не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза Альтернативному победителю № 1 в связи с нарушением правил Игры, право на приз переходит Альтернативному победителю № 2.

9.7. Альтернативный победитель № 2 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS до 30 апреля 2020 г. включительно. Для получения приза Альтернативный победитель № 2, которому перешло право на получение приза, должен до 4 мая 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2 правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, Независимости, 200 в срок до 6 мая 2020 г. включительно.

9.8. Альтернативный победитель № 2 утрачивает право на получение приза, если с ним не удается связаться любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 2 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо Альтернативный победитель № 2 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 2 не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза в связи с нарушением правил Игры.

9.9. В случае если победитель (Альтернативный победитель № 1 или № 2) не может приехать за получением приза лично, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта либо вида на жительство победителя (Альтернативный победитель № 1 или № 2), своего паспорта либо вида на жительство и нотариально заверенной либо приравненной к таковой доверенности от победителя (Альтернативного победителя № 1 или № 2).

9.10. С момента передачи приза к победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или № 2) переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом. Денежная компенсация стоимости призов не производится. Победитель, (соответственно – Альтернативный победитель № 1 или № 2) (в случае их нежелания получить приз) не вправе передать право на получение приза другому лицу. Приз не подлежит замене.

9.11. В соответствии с законодательством Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет в бюджет подоходный налог в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, из суммы денежных средств соответствующего приза. Вручение призов осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза.

9.12. Организатор не оплачивает победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или № 2) расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

**10. Порядок информирования об условиях и результатах Игры**

10.1. Факт участия в Игре означает, что Участники Игры соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фото-, аудио-, видео- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором и Заинтересованным лицом в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору, заинтересованному лицу.

10.2. Участник Игры, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Игры для получения приза.

10.3. Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников Игры с настоящими Правилами.

10.4. Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда». Информация о результатах розыгрыша публикуется до 4 мая 2020 г. включительно в газете «Звязда».

10.5. Телефон для справок по вопросам проведения Игры: (МТС – 033, А1 – 029, Life – 025) 6 431 431 круглосуточно без выходных.

*Свидетельство № 3751 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 18 февраля 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# Проектная декларация

Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

Застройщик – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей от 27.02.2014 за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А.

Тел./факс: (8017) 204 67 99; (8017) 399 53 94; (8017) 256 64 18, (8044) 785 84 81; (8029) 323 11 11.

Режим работы – приемное время: понедельник, среда – с 8.45 до 13.00; вторник, четверг – с 14.00 до 18.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 4 по ул. Маршала Лосика;
2. Жилой дом № 27 по ул. Маршала Лосика;
3. Жилой дом № 29 по ул. Маршала Лосика;
4. Жилой дом № 32 по ул. Маршала Лосика;
5. Жилой дом № 3А по ул. Максима Горецкого;
6. Жилой дом № 15 по ул. Юрия Семеняко;
7. Жилой дом № 6 по ул. Маршала Лосика;
8. Жилой дом № 4 по ул. Малакович.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 16.07.2019 № 303-15/19;

- решение Мингорисполкома от 09.08.2019 № 2407 «Об изъятии и предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;

- извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 28.08.2019 № 2-208Ж-061/19;

- договор строительного подряда от 19.08.2019 № 19-08/2019 с ОАО «МАПИД».

**Информация о проекте.**

Проектом предусмотрено строительство объекта «Многоквартирный жилой дом № 7/1 по генплану в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 4 (2-я очередь строительства)».

Жилой дом № 7/1 по генплану запроектирован как двухсекционный панельный 16-этажный, 127-квартирный жилой дом, на базе номенклатуры индустриальных изделий серии М 464-М, с техническим подпольем и чердаком. В каждой секции запроектировано 2 лифта.

На первом этаже предусмотрено размещение помещения товарищества собственников с отдельным входом снаружи и электрощитовой.

Внутренняя отделка:

стены – обои в жилых комнатах, прихожих, коридорах, кухнях, акриловая покраска в санузлах;

потолки – акриловая покраска;

полы – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове в жилых комнатах, коридорах, кухнях, кладовых, керамическая плитка в санузлах;

окна – профиль ПВХ (СТБ 1107), оснащены детскими замками безопасности;

двери – деревянные.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (по направлениям администраций районов г. Минска):

- 2 (две) однокомнатных квартиры;
- 62 (шестьдесят две) двухкомнатные квартиры;
- 63 (шестьдесят три) трехкомнатные квартиры;

Цена 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства в жилом доме № 7/1 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет: для нормативной площади – 1567,68 бел. рублей; для площади, превышающей нормативную, – 1787,98 бел. рублей.

Начало строительства – 22 августа 2019 года.

Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – 20 декабря 2020 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, к. 102.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;

- быть готовым оплатить в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента получения договора до 25 процентов от общей стоимости объекта долевого строительства.

# Проектная декларация

Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

Застройщик – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей от 27.02.2014 за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А.

Тел./факс: (8017)204 67 99; (8017)399 53 94; (8017)256 64 18,(8044)785 84 81; (8029)323 11 11.

Режим работы – приемное время: понедельник, среда с 8.45 до 13.00; вторник, четверг с 14.00 до 18.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 4 по ул. Маршала Лосика;
2. Жилой дом № 27 по ул. Маршала Лосика;
3. Жилой дом № 29 по ул. Маршала Лосика;
4. Жилой дом № 32 по ул. Маршала Лосика;
5. Жилой дом № 3А по ул. Максима Горецкого;
6. Жилой дом № 15 по ул. Юрия Семеняко;
7. Жилой дом № 6 по ул. Маршала Лосика;
8. Жилой дом № 4 по ул. Малакович.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 24.04.2019 № 121-15/19;

- решения Мингорисполкома от 18.04.2019 № 1153 «Об изъятии и предоставлении земельных участков и разрешении строительства», от 25.07.2019 № 2246 «Об изменении решения Мингорисполкома от 19 апреля 2019 г. № 1153»;

- извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 20.06.2019 № 2-208Ж-037/19;

- договор строительного подряда от 20.06.2019 № 20-06/2019 с ОАО «МАПИД».

Информация о проекте.

Проектом предусмотрено строительство объекта «Многоквартирный жилой дом № 7/2 по генплану в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 4. (2-я очередь строительства)»;

Жилой дом № 7/2 по генплану разработан на базе номенклатуры индустриальных изделий серии М464 - У1 М. Здание запроектировано десятиэтажным, четырехсекционным, с техническим подпольем и теплым техническим чердаком. В жилом доме размещено 169 квартир. В каждой секции предусмотрен один лифт грузоподъемностью 630 кг. Здание жилого дома запроектировано без мусоропровода, в каждой секции предусмотрены мусоросборные камеры для установки контейнера.

На первом этаже первой секции размещено помещение товарищества собственников.

Внутренняя отделка:

стены – оклейка обоями под окраску, окраска акриловыми составами в жилых комнатах, коридорах, кухнях; окраска влагостойкой акриловой краской в санузлах, ванных;

потолки – покрытие защитно-декоративным полимерным составом в жилых комнатах, коридорах, кухнях; окраска влагостойкой акриловой краской в санузлах, ванных;

полы – линолеум на теплоизолирующей подоснове в жилых комнатах, коридорах, кухнях; керамическая плитка в санузлах, ванных;

окна – профиль ПВХ (СТБ 1108-98), оснащены детскими замками безопасности;

двери – деревянные.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (по направлениям администраций районов г. Минска):

- 91 (девяносто одна) двухкомнатная квартира;
- 78 (семьдесят восемь) трехкомнатных квартир.

Цена 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства в жилом доме № 7/2 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет: для нормативной площади – 1089,44 бел. рублей; для площади, превышающей нормативную, – 1545,55 бел. рублей.

Начало строительства – 20 июня 2019 года.

Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – 20 декабря 2020 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, к. 102.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;

- быть готовым оплатить в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента получения договора до 40 процентов от общей стоимости объекта долевого строительства.

По розныя бакі

# У ЗОНЕ РЫЗЫКІ

## ЯКІЯ КАШТОЎНАСЦІ ХАЦЕЛАСЯ Б ВЯРНУЦЬ У ШКОЛУ?

**З першага дня новага навучальнага года сын Ганны ездзіць у школу на электрасамакаце, які яму падарылі на дзень нараджэння бацькі. Гэта стала прычынай незадаволенасці адміністрацыі.**
**«У канцы мінулага тыдня сын паскардзіўся, што дырэктар школы забараніла прыязджаць на любых самакатах і роварах. Аргумент — дзеці робяць гэта масава, а ставіць іх няма куды. Няўжо гэта такая праблема, што трэба забараняць дзецям перасоўвацца, як яны хочуць?» — здзіўляецца жанчына.**
**З такім жа падыходам школьнай адміністрацыі сутыкнулася і другая мінчанка. На днях яе сына і яго аднакласнікаў паўшчувала класны кіраўнік за тое, што ездзяць у школу на самакатах, скейтах і гіраскутарах.**
**«Хлопцы пакідаюць іх пры ўваходзе ў школу, у калідорах не катаюцца, таму я не магу зразумець, у чым праблема. Патэлефанавала завучу, каб разабрацца ў сітуацыі. А яна сказала, што дзеці павінны хадзіць у школу пешшу, што няма чаго купляць ім дарагія рэчы і патураць іх капрызам, — скардзіцца мама школьніка. — Увогуле мне далі зразумець, што школа баіцца крадзяжу і не хоча мець справу з міліцыяй, калі нешта здарыцца...»**
**Гэты кейс сярод іншых быў прапанаваны ўдзельнікам адукацыйнага бранча. Падчас чарговай нефармальнай сустрэчы ў цэнтры ўвагі аказаліся настаўніцкая этыка, рызыкі і вырашэнне канфліктных сітуацый.**



Яўген ЛУФЕРЧЫК: «Дзе знаходзіцца зона адказнасці сям'і і ці ўсё школа робіць правільна?»



Валянціна ЧЭКАН: «Канфліктныя сітуацыі ўсё часцей выходзяць за сцены школы. Сённяшняя тэма вельмі «гарачая»...

### РАСЧАРАВАННЕ І СТОМЛЕНАСЦЬ

— Сённяшняя тэма самая гарачая. Падагрэтая эмоцыямі і паведамленнямі ў СМІ, яна патрабуе ўсеагульнай увагі і асэнсавання. З нашага пункту гледжання, яна павінна быць прапушчана праз прызму асабістай адказнасці кожнага з удзельнікаў адукацыйнага працэсу, — адразу папярэдзіла ўсіх прысутных адна з ініцыятараў сустрэчы, **сузаснавальнік акадэміі крэатыўных тэхналогій IT Princess і прыватнай школы STEAM, выкладчык, ментар Валянціна ЧЭКАН.** — Апошнім часам канфліктныя сітуацыі ўсё часцей выходзяць за сцены школы і дзякуючы сучасным тэхналогіям хутка становяцца здабыткам грамадскасці. Калі мы бачым чарговы загаловак кшталту «Настаўніцу, якая накрычала на чацвёртакласнікаў, звольнілі» ці «Трэсну, потым паглядзім. Настаўніца пагражала забіць партай дзіця», што мы з вамі пры гэтым адчуваем?

Падобныя выпадкі настолькі эмацыянальна жудасныя, настолькі складаныя ў сваіх прычынах, што нам нават не хочацца зазіраць унутр і думаць пра іх. Але мне здаецца, што гэта ўсё ж такі трэба рабіць. Мы павінны зразумець, дзе адбываюцца сістэмныя памылкі, дзе прычынай становяцца нейкія асобасныя якасці настаўніка, а дзе прысутнічае і першае, і другое. У кожнай канфліктнай сітуацыі абавязкова ёсць яшчэ і асабовыя абставіны, якія прадухіляць у поўнай меры немагчыма.

Педагогам было прапанавана разабраць сітуацыі, якія дзякуючы СМІ на ўсіх на слыху, і вызначыць дрэва прычын (першасных, другасных і базавую), па якіх гэты канфлікт стаў магчымым. Вынік, як прызналіся арганізатары сустрэчы, іх крыху здзівіў.

— У нас была гіпотэза, што прычыны будуць прыблізна аднолькавыя, — канстатаваў другі арганізатар сустрэчы, **кіраўнік IT-школы Myfreedom, архітэктар адукацыйных сістэм, адукатар Яўген ЛУФЕРЧЫК.** — Але раптам аказалася, што праблем значна больш і нават складана іх неяк класіфікаваць.

Дык якія ж прычыны называлі педагогі? Высокі ўзровень агрэсіі ў грамадстве, талерантнасць да гвалту, неабароненасць педагога, яго стомленасць, эмацыянальнае выгаранне, недахопы ў сямейным выхаванні, перакладанне бацькамі адказнасці на школу, выкананне педагогамі не сваіх функцый, адсутнасць правілаў, абавязковых для ўсіх, неабходнасць «цягнуць» да выпускнога класа падлеткаў, якіх вучоба зусім не цікавіць, адсутнасць прававой базы па многіх актуальных пытаннях накшталт захоўвання тых жа гіраскутараў і самакатаў у школах (яна відавочна адстае ад патрэб сённяшняга дня), нежаданне школ браць адказнасць за чужую маёмасць і трапляць у поле зроку міліцыі і іншыя.



Усім прапанавалі ўжыцца ў ролю і адказаць на пытанне: «Што я магу, хачу і буду рабіць як актыўны грамадзянін, адміністрацыя, адзін з бацькоў і настаўнік?».

— Для мяне асабіста застаецца адкрытым пытанне, дзе знаходзіцца зона адказнасці сям'і і ці ўсё школа робіць правільна, таму што ўсе сем'і — унікальныя, а мы, педагогі, ці заўсёды гэта ўлічваем? — задаўся пытаннем Яўген Луферчык. — Больш таго, і рамкі каштоўнасцяў могуць быць розныя: у дырэктара школы яны адны, у завуча — другія, а ў настаўніка матэматыкі — трэція. Праблема, пагадзіцеся, прысутнічае.

Сацыяльны статус настаўніка, яго бяспраўнасць перад адміністрацыяй і неабароненасць перад бацькамі навучэнцаў традыцыйна імгненна «запалілі» аўдыторыю.

— А я лічу, што педагог — вольны чалавек. І калі я ўваходжу ў аўдыторыю і зачыняю за сабой дзверы, я раблю і кажу тое, што лічу важным і правільным. Гэта зона маёй асабістай адказнасці, — падзялілася сваім меркаваннем Валянціна Чэкан.

Не менш гарачай аказалася і дыскусія на тэму, ці абавязаны настаўнік любіць сваіх вучняў. Меркаванні аўдыторыі, трэба заўважыць, падзяліліся.

— Я ўпэўнены, што кожны з нас з'яўляецца носьбітам свайго унікальнага досведу. Мяркую, што пад словам «любоў» мы разумеем рознае. У беларускай мове ёсць «любоў» і ёсць «каханне». І гэта розныя паняцці. У рускай мове ў слове «любоў» я не магу вылучыць інтымны складнік, і менавіта таму кажу, што сваіх вучняў паважаю, цаню, хачу быць для іх максімальна карысным, але люблю я сваю сям'ю, сваю жонку і дзяцей, таму што з імі ў мяне ёсць інтымная сувязь. Хоць ведаю настаўнікаў, у якіх з вучнямі ёсць гэтая сувязь, і яны да іх ставяцца, як да сваіх дзяцей, — шчыра прызнаўся Яўген Луферчык.

<u>У адказ на просьбу вызначыць тры базавыя каштоўнасці, якія хацелася б вярнуць у школу і ў грамадства, педагогі назвалі павагу, свабоду і бяспеку.</u>

А на прапанову ахарактарызаваць, як яны сябе адчуваюць унутры сістэмы адукацыі (хоць словамі, хоць малюнкамі), педагогі напісалі наступнае: «Шмат фармалізму», «Кагнітыўны дысананс, сорам перад дзецьмі», «Немагчымасць ні на што паўплываць», «Нестабільнасць, няма ўпэўненасці, што я тут надоўга», «Бессэнсоўнасць многага з таго, што раблю», «Залежнасць ад вышэйстаячых органаў, ад настрою навучэнцаў, нявыхаванасці іх бацькоў», «Ты ўсім павінны!», «Расчараванне, злосць, стомленасць ад непаразумення», «Асалода, кайф ад работы з унутрана матываванымі навучэнцамі», «Свабодна, класна, нягледзячы ні на што!», «Цікава. Ёсць ідэі».

### ХТО ВЫ ТУТ ТАКАЯ?

А вось яшчэ адна праблема, пра якую ў нашым грамадстве не прынята казаць услых, — булінг настаўнікаў. Так, менавіта педагогаў, а не вучняў. У ходзе даследавання, праведзенага ў Расіі, 70 % настаўнікаў паведамілі, што станавіліся ахвярай булінгу. Вучні ігнаруюць педагогаў, зрываюць урокі, дэманструюць ім непатрэбнасць іх дысцыпліны, пагарду з дапамогай жэстаў і позіркаў, скардзяцца на іх кіраўніцтву школы з надуманых нагод, абзываюць, распускаюць чуткі, прыдумваюць крыўдныя мянушкі, накіроўваюць паведамленні інтымнага характару, абражаюць у сацыяльных сетках... Бацькі, здараецца, вядуць сябе не лепш за сваіх дзяцей, аб'ядноўваюцца ў чатах. Тады настаўнік атрымлівае яшчэ адну дысфункцыянальную групу, толькі з дарослых. Працаваць з ёй яшчэ цяжэй, чым з групай дзяцей, таму што сацыяльныя ролі бацькоў і настаўнікаў зраўняліся. Заўвага ў дзённіку і выклік да дырэктара ўжо нічога не значаць. Бацькі патрабуюць ад педагогаў індывідуальнага падыходу да іх дзяцей, пэўнага знешняга выгляду ад настаўніка... Педагогі з нізкім узроўнем даходу зазнаюць здзекі ўдвая часцей. Падчас расійскага даследавання на глыбінным інтэрв'ю адна мама заявіла, што «яе дзіцяці непрыемна прыходзіць у клас да жанчыны, якая носіць адну і тую ж кофту кожны дзень трэці год запар». Прычым гэта была самая звычайная сям'я з сярэднім дастаткам.

Але ёсць яшчэ і <u>булінг у настаўніцкай — з боку адміністрацыі і калег.</u> Адкрытае цкаванне — псаванне асабістых рэчаў або фізічны гвалт (напрыклад, з настаўніцкай вылятаюць чыесьці чаравікі). Да схаваных формаў адносіцца абмеркаванне асабістага жыцця ці знешняга выгляду настаўніка паміж сабой, але ў яго прысутнасці, напружанне, якое настаўнік адчувае ў класе, калі гучыць смех нібыта без нагоды. Гэта можа быць канфлікт на міжасобасным узроўні, непапулярнасць ці прэсінг. Адзін з варыянтаў прэсінгу, з якім сутыкаюцца настаўнікі, — працяглы псіхалагічны ціск з боку школьнага кіраўніцтва або чыноўнікаў у сферы адукацыі. Часам булінг можа стаць прычынай сыходу настаўніка з прафесіі.

**Усе гэтыя выпадкі настолькі эмацыянальна жудасныя, што нам нават не хочацца зазіраць унутр.**

Удзельнікі адукацыйнага бранча прыгадалі фразы-маркеры булінгу ў настаўніцкай, якія яны чулі на свой адрас: «Што вы сабе дазваляеце?», «Хто вы тут такая?», «Ёй прэмія непатрэбная, бо ў яе муж багаты», «Што ў вас за знешні выгляд?», «Вось яшчэ, яе нават звольніць нельга», «Вы некампетэнтны», «Што ты як белая варона!», «Табе, дзяўчынка, больш за ўсіх трэба?», «Не высоўвайся», «Вы лічыце мяне дурніцай?», «Вой, я таксама была такой жа наіўнай», «Выскачка», «Зорка», «Ваш знешні выгляд не адпавядае статусу», «Больш так не адзявайцеся», «Занадта кароткая спадніца», «А што, галава па-ранейшаму яшчэ на моры?», «Таму што ў яе няма сям'і (дзяцей)», «Дзяўчынка, у цябе маладосць у галаве», «Зазвяздзілася»...

На думку ўдзельнікаў сустрэчы, у педагагічнай ВНУ выкладаецца мноства дысцыплін, але будучых педагогаў не вучаць канфлікталогіі, эмацыянальнаму інтэлекту, стрэсаўстойлівасці, кіраванню класам і групай, педагагічнай рэфлексіі і ўменню прааналізаваць і абагульніць свой вопыт, педагагічнай этыцы і эстэтыцы, крэатыўнаму мысленню, узроставай і сацыяльнай псіхалогіі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара.**

### ЗА АБРАЗУ — ДА АДКАЗНАСЦІ

У Беларусі плануецца ўвядзенне адміністрацыйнай адказнасці за абразу настаўнікаў. Пра гэта расказала **намесніца кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС** падчас наведвання Ваўкавыскага педагагічнага каледжа.

— Педагога неабходна аберагаць з пункту гледжання эканомікі і сацыяльнай справядлівасці. Прычым менавіта прававымі сродкамі, — пераканааная Вольга Чупрыс. — Напрыклад, нямала падзей адбылося летась менавіта негатыўнага толку, калі школьнікі спрабавалі, скажам так, ціснуць на настаўнікаў. Часам такія сітуацыі даходзяць да адкрытых абраз школьнага настаўніка.

Грамадству трэба стаць на абарону педагогаў. Гэта можна зрабіць, выкарыстоўваючы, напрыклад, вопыт нашага ўсходняга суседа — Казахстана, дзе ўвялі адміністрацыйную адказнасць за абразу настаўніка пры выкананні службовых абавязкаў. Мы прыглядзеліся да гэтага навацыі і плануем увесці такую ж норму ў наш кодэкс.



# ПА ПРОМЕНІ ЛАЗЕРА — НА МІЖНАРОДНЫЯ РЫНКІ

## Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук, дырэктарам навукова-тэхнічнага цэнтра «ЛЭМТ» БелОМА Аляксеем ШКАДАРЭВІЧАМ

**ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎНІКА**

*Нарадзіўся Аляксей Пятровіч у Капылі, сталіцы беларускіх гарбароў. Пасля школы паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Ужо падчас вучобы на фізфаку БДУ ўдзельнічаў у стварэнні першай у краіне лініі аптычнай сувязі. Затым была работа ў Інстытуце фізікі НАН Беларусі — у лабараторыі фізікі інфрачырвоных промняў, якой кіраваў акадэмік Мікалай Барысевіч, прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук. А непасрэдным кіраўніком з'яўляўся Аляксей Вайтовіч, таксама ў будучым кіраўнік Нацыянальнай акадэміі навук.*

*Кандыдацкую дысертацыю па тэме «Уплыў нелінейных эфектаў на параметры газавых лазераў у магнітным полі» абараніў пасля вучобы ў аспірантуры Інстытута фізікі. І вось ужо больш за 40 гадоў працуе на БелОМА. Дзякуючы яго намаганням, навуковай інтуіцыі і кіраўніцкаму вопыту міжгаліновы канструктарскі аддзел (МКА) тут вырас у прадпрыемства з сусветным імем — навукова-тэхнічны цэнтр «ЛЭМТ» (Лазеры ў экалогіі, медыцыне, тэхналогіі).*

*Доктарскую дысертацыю па тэме «Цвёрдацельныя перабудоўваемыя лазеры з селектыўнай напампоўкай» беларускі вучоны абараняў не ў Мінску, а ў Дзяржаўным аптычным інстытуце імя С. Вавілава ў Ленінградзе, вучоны савет якога вызначаўся надзвычай высокай патрабавальнасцю да ўзроўню дысертацый. Абарона прайшла паспяхова, і Аляксею Пятровічу была прысвоена вучоная ступень доктара фізіка-матэматычных навук.*

*Ён аўтар (і суаўтар, што не менш ганарова) шматлікіх вынаходніцтваў. Асабіста ўдзельнічаў у распрацоўцы і ўкараненні ў вытворчасць беларускіх лазераў вельмі шырокай гамы, аптычных і оптыка-электронных прыцэлаў, інтэлектуальных аптычных прыцэлаў, тэхнікі нанакантролю ў сучаснай вытворчасці, лазерных медыцынскіх апаратаў новага пакалення — усяго ў кароткім газетным артыкуле не пералічыш.*

*У 2004 годзе стаў членам-карэспандэнтам акадэміі навук, а ў 2014 годзе абраны акадэмікам НАН Беларусі. Прафесар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Усе гэтыя вышыні заваяваны падчас работы на БелОМА. Што сведчыць толькі пра адно: вытворчасць тут цвёрда будуецца на грунце навукі.*

*Наш славуты зямляк чытае лекцыі ў многіх краінах свету, дзе існуюць і свае моцныя навуковыя школы: у Злучаных Штатах Амерыкі, Японіі, Германіі, Францыі, Італіі, Бразіліі, Польшчы, Кітаі... І кожны раз яго запрашаюць прыехаць зноў.*

*Жанаты. У Аляксея Пятровіча двое дзяцей і пяцёра ўнукаў.*

***— Паважаны Аляксей Пятровіч, калі меркаваць па экспазіцыях ЛЭМТа на спецыялізаваных выстаўках, за апошні час у вас з'явілася шмат навінак. Мяне цікавяць з мінулых нашых сустрэч оптыка для беспілотнікаў, цеплавізары — тады ўсё толькі пачыналася. Інфрачырвоная оптыка, у тым ліку асферычная.***

— Сёння гэта — ужо серыйныя вырабы, якія прадаюцца і прыносяць прадпрыемству прыбытак. Тэма беспілотнікаў сёння на слыху, а без оптыкі яны як без вачэй. Чытачу будзе цікава даведацца, што з вырабу оптыкі для беспілотнікаў мы пераключыліся на выпуск вырабаў больш складаных, больш высокага класа — оптыкі для выяўлення беспілотнікаў. І цяпер робім оптыку для выяўлення беспілотнікаў гранічна малых памераў. Вы павінны разумець, наколькі гэта актуальна.

А цеплавізары — адна з састаўных частак гэтых сістэм. Выявіць беспілотнік важна не толькі днём, але і ўначы, калі звычайныя аптычныя прыборы іх не «бачаць». І да таго ж, часцей за ўсё ва ўмовах менавіта дрэннай бачнасці, калі нізкая воблачнасць альбо дымка, пыл і гэтак далей. І менавіта цеплавізары дазваляюць працаваць усёпагодна на працягу сутак, не робячы розніцы паміж днём і ноччу. Сакрэт у тым, што гэтыя прыборы рэагуюць не на карцінку, а на розніцу тэмператур. Калі нейкі прадмет мае тэмпературу нават на дзясятую частку градуса вышэйшую, чым навакольнае асяроддзе, то такі прадмет будзе выяўлены. А сучасныя распрацоўкі дазваляюць гаварыць ужо нават пра адну сотую градуса розніцы, і яна рэгіструецца. Замаскіравацца становіцца практычна немагчыма.

***— Цеплавізары працуюць толькі па беспілотніках, ці дыяпазон выкарыстання шырэйшы?***

— Нашы сістэмы стаяць і на ахове граніцы, на пагранічных вышках вядуць аўтаматычны кругласутачны кантроль. Сістэма з дапамогай датчыкаў руху скануе дараваны ёй участак граніцы і выяўляе, калі ёсць адхіленні, скажам так, ад нормы. Загараецца сігнал трывогі, і сістэма пачынае за гэтым аб'ектам сачыць. Ёсць магчымасць яго значнага павелічэння, што спрашчае задачу ідэнтыфікацыі: хто гэта — звер, чалавек, аўтамабіль, робат ці той жа беспілотнік.

Калі пайсці далей, то цеплавізар — гэта і ёсць адзін з прадстаўнікоў інфрачырвонай оптыкі, якая працуе ў некалькіх дыяпазонах: бліжнім, сярэднім і дальнім. Бліжні — прыборы начнога бачання, грунтуюцца на так званых узмацняльніках яркасці, калі малапрыкметны аб'ект робяць яркім. Цеплавізары выяўляюць цеплавыя аб'екты. А асферычная оптыка дазваляе зменшыць габарыты ўсёй сістэмы, вагу яе, і сістэма становіцца больш кампактная.

***— Ці з'явілася нешта новае ў лазернай оптыцы?***

Сімвалічна: кнігу прэзентавалі ў Дзень роднай мовы. «Працэсы глабалізацыі непазбежныя, і таму перад многімі народамі стаіць вострая праблема захавання сваіх моў. Адным са шляхоў яе вырашэння з'яўляецца захаванне мовай асноўнай сваёй камунікатыўнай функцыі, захаванне прэстыжу мовы сярод моладзі і прысутнасць мовы ў інтэрнэт-прасторы, каб усё ж такі захоўвалася пераемнасць паміж пакаленнямі. Яшчэ адзін з найважнейшых аспектаў — гэта мастацкая літаратура. Тое, што сёння ў нас з'явілася такое выданне, па-свойму ўнікальнае, якраз дае надзею, што мова будзе жыць і развівацца, — мяркуе **дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук Ігар КАПЫЛОЎ.** — Не меншая падзея тое, што яна з'явілася на беларускай мове, бо перадаць такія тонкія пачуцці — заўсёды няпроста, тым больш што гэта пераклад мастацкага тэксту. Прачытаўшы кнігу, я і мае калегі з Інстытута мовазнаўства адзначылі сапраўды высокі прафесіяналізм як аўтараў, так і перакладчыка».

Падтрымаў яго і **начальнік упраўлення маніторынгу якасці навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь» Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ.** Ён адзначыў, што з'яўленне перакладной літаратуры — важны крок у развіцці і нацыянальнай літаратуры. «Прадстаўляючы Інстытут адукацыі, магу сказаць пра існаванне адной важнай праблемы — праблемы вывучэння літаратуры ў кантэксце сусветнай. Калі я, напрыклад, займаюся падборам літаратуры для ўключэння ў школьныя праграмы і шукаю творы з іншых нацыянальных літаратур, то вельмі часта няма іх перакладу на беларускую мову. Таму, лічу, нашым перакладчыкам трэба думаць менавіта ў гэтым кірунку. Бо перакладаецца, здаецца, шмат твораў, але пераклады для дзяцей і падлеткаў — гэта асобны свет. І тут у нас яшчэ існуюць пэўныя прабелы».

**Алена ДРАПКО.**

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Кнігазбор

# У лідарах — «Гары Потэр»

**Што найбольш набывалі нашы суайчыннікі ў студзені 2020 года з кніг, выдадзеных у краіне на беларускай мове?**

На гэтае пытанне паспрабуем адказаць з дапамогай рэйтынга продажаў па кнігарнях «Белкнігі». Абсалютным лідарам з'яўляецца «Гары Потэр і філасофскі камень» Д. Роўлінг у перакладзе на беларускую мову. Выдавец — Андрэй Янушкевіч. На другім месцы — з істотным адставаннем — раман «Мова» Віктара Марціновіча, які выйшаў у «Кнігазборы» (пакупнікі набылі 72 паасобнікі). На трэцім — славуты «Маленькі прынц», пераўвасоблены па-беларуску, якога прададзены 71 экзэмпляр. На чацвёртым месцы — хрэстаматыя для дашкольнікаў «Залатая скарбонка» (63 экзэмпляры). На пятым — фотаальбом А. Ласмінскага «Гродна» (45 экзэмпляраў).

Што цікава, у першую дзясятку лідараў продажаў увайшлі і «Людзі на балоце» народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. У другой дзясятцы 11-е, 13-е і 16-е месцы занялі кнігі Уладзіміра Караткевіча: «Каласы пад сярпом тваім», «Дзікае паляванне караля Стаха» і «Чорны замак Альшанскі». Класік гістарычнай прозы яшчэ і на 26-м месцы — з раманам «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Усе гэтыя кнігі пабачылі свет у выдавецтве «Попурри».

У рэйтынгу продажаў «Белкнігі» са 100 назваў (пачынаючы ад лідара, «Гары Потэра...») сваё месца занялі і кнігі многіх сучасных беларускіх пісьменнікаў: Ганны Севярынец, Святланы Алексіевіч, Віктара Ермаловіча, Алены Стэльмах, Генадзя Аўласенкі, Людмілы Рублеўскай, Сяргея Чыгрына, Кацярыны Хадасевіч-Лісавой, Сяргея Давідовіча, Віктара Гардзея, Сяргея Мінскевіча, Уладзіміра Арлова, Віктара Шніпа, Віктара Корбута, Галіны Нічыпаровіч, Аляксея Якімовіча, Валеры Гапеева, Анатоля Зэкава (студзеньскія продажы ад 22 да 6 экзэмпляраў). Зразумела, што ў вялікай колькасці кнігі набываюцца непасрэдна бібліятэкамі альбо распаўсюджваюцца на прэзентацыях з удзелам аўтараў на розных пляцоўках. І продажы ў гандлі болей чым 100 аб'ектаў ААТ «Белкнігі» — не самы аб'ектыўны і тым болей не поўны паказчык цікавасці да творчасці таго ці іншага аўтара. І ўсё ж такія рэйтынгі па-свойму цікавыя і таксама з'яўляюцца ў пэўнай ступені характэрыстыкай запатрабаванняў чытача і пакупніка.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# Навучыцца арыстакратычным манерам

## і стаць мадэллю за дзяржаўны кошт



**Гэтая работа асацыюецца з раскошай і багаццем: мадэлям даступныя найлепшыя ўборы ад папулярных куцюр'е і каштоўнасці, яны асабіста знаёмыя з зоркамі шоу-бізнесу і спорту, палітыкамі. У Беларусі дзяржава выдзяляе грошы на тое, каб навучыць прафесіі дзяўчат і хлопцаў, якія мараць пакарыць подыум. Да таго ж нядаўна Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб мадэльнай дзейнасці», накіраваны на яе развіццё, абарону правоў і законных інтарэсаў удзельнікаў сферы і папулярызацыю беларускай моды. Намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Цэнтр «Нацыянальная школа прыгажосці» Дзмітрый ВРУБЛЕЎСКІ расказаў, чаму неабходны быў гэты дакумент і на якіх умовах прымаюць маладых людзей у такую школу.**



— Сферу мадэлінгу ўжо даўно трэба было ўрэгуляваць. Да гэтага ўказа мы ў сваёй рабоце выкарыстоўвалі існуючыя грамадзянска-прававыя нормы і працавалі па прынцыпе «тое, што не забаронена, — дазволена». Але ёсць у нашай сферы і спецыфічныя нюансы, і часта аказвалася так, што не ўсё, што «не забаронена», — дазволена, таму наша школа ініцыявала распрацоўку новага дакумента. Цяпер выйшла пастанова пра рэалізацыю новага ўказа. Работа над ёй была калектыўнай, з удзелам шэрагу міністэрстваў — адукацыі, унутраных спраў, культуры, працы і сацыяльнай абароны, фінансаў, а таксама Мінгарвыканкама і Нацыянальнай школы прыгажосці. Указ і пастанова рэгламентуюць міграцыю і працаўладкаванне, гарантуюць бяспеку нашых грамадзян за мяжой. Мы спадзяёмся, што неабходныя механізмы пачнуць працаваць.









***— Раскажыце пра гісторыю стварэння Нацыянальнай школы прыгажосці.***

— Наша школа была створана ў 1996 годзе ўказам Прэзідэнта, які даручыў Міністэрству культуры зрабіць Цэнтр па падрыхтоўцы конкурсаў прыгажосці, у першую чаргу нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь». Тады нашу школу стварылі на базе харэаграфічнага каледжа. Ужо з 1997-га мы пачалі працаваць. Першапачаткова нашай задачай была толькі падрыхтоўка фіналістак да конкурсу. Тады не было навучання ў тым варыянце, які існуе цяпер. Некалькі месяцаў мы працавалі з дзяўчатамі па розных кірунках: дэфіле, акцёрскае майстэрства, этыкет, цырульнае мастацтва, візаж і іншыя. Фіналісткі, атрымаўшы шанц трапіць у тэлевізійную версію, павінны выглядаць прыгожымі не толькі ў тэлекамеры, але і па-за подыумам. Цяпер жа пры падрыхтоўцы да конкурсу мы робім большы ўхіл на рэпетыцыі, таму што дзяўчаты тых гадоў і сучасныя зусім рознага ўзроўню падрыхтаванасці. Але аснова школы мадэлінгу была пакладзена менавіта тады. Сёння Нацыянальная школа прыгажосці адзіная ў краіне, якая выпускае мадэляў, выдае ім дакумент дзяржаўнага ўзору па прафесіі «мадэль» з прысваеннем чацвёртага разраду. Яго можна павысіць, але толькі калі мадэль працуе ў такой сферы. Раней было прасцей атрымаць работу па гэтай прафесіі, таму што манекеншчыцы ўваходзілі ў штат прадпрыемстваў, на якіх тады часта рабілі адкрытыя і закрытыя паказы адзення і абутку. Там дзяўчаты і павышалі сваю кваліфікацыю. У сучасных рэаліях у Беларусі такая неабходнасць адпала. Але запыт на прафесію ёсць, праўда, паўнавартаснага працаўладкавання не будзе. Па неабходнасці мадэлі прыцягваюцца як пазаштатныя супрацоўнікі па дагаворах падраду і іншых грамадзянска-прававых дагаворах.

***— Вы сказалі, што дзяржава фінансуе навучанне мадэляў...***

— Так. Дзяржава раней фінансавала толькі падрыхтоўку фіналістак, а цяпер і падрыхтоўку мадэляў. У нас ёсць план прыёму — мы набіраем дзве групы за год на бюджэтную форму навучання: у першым паўгоддзі — 25 чалавек і ў другім столькі ж. Канешне, паралельна з бюджэтнай формай навучання мы набіраем платную групу. Мадэль — гэта прафесія, якая не патрабуе вышэйшай адукацыі, але магчымасць для людзей ад 16 да 25 гадоў атрымаць дадатковыя навыкі і быць больш канкурэнтаздольнымі на рынку працы, мець нешта яшчэ, акрамя асноўнай прафесіі, якую яны атрымліваюць у ВНУ і каледжах.

***— Па якіх крытэрыях вы адбіраеце будучых мадэляў?***

— Асноўны крытэрый — гэта рост. Да хлопцаў у нас патрабаванне, каб быў не ніжэйшы за 185, да дзяўчат — ад 175. Апошнім часам мы разглядаем дзяўчат і на 1-2 см ніжэй, таму што колькасць тых, хто мае рост, які перавышае 175 см, з кожным годам усё памяншаецца. Мне нават здаецца, што беларускія дзяўчаты становяцца ніжэйшыя *(смяецца)*. У дакументах мы можам замацаваць толькі рост — мы не можам замацаваць харызму, знаходлівасць, пачуццё гумару, ініцыятыўнасць, камунікабельнасць, таму што няма крытэрыяў для вымярэння гэтых характарыстык. Мы ствараем прыёмную камісію, і рашэнне аб залічэнні на бюджэтную форму прымаецца калегіяльна. Стараемся адбіраць людзей так, каб потым яны не «дэвальвавалі» пасведчанне аб навучанні, таму што гэта наш імідж. І я думаю, што ў нас атрымліваецца. Я, напрыклад, не ведаю ніводнага сур'ёзнага паказу ў краіне, дзе б не ўдзельнічала хоць адна наша мадэль.

***— Якія дысцыпліны выкладаюць у вашай школе і колькі трэба вучыцца, каб атрымаць гэтую прафесію?***

— Заняткі праходзяць тры разы на тыдзень, каб паспець за чатыры месяцы прайсці ўвесь план навучання. Вучым усяму, пачынаючы ад дэфіле і заканчваючы аховай працы. Тут і акцёрскае майстэрства, і асновы стылю, і харэаграфія — увогуле ўсё, што неабходна ведаць прафесійнай мадэлі.

***— Вы не толькі займаецеся навучаннем, але і працуеце як мадэльнае агенцтва...***

— Канешне, у нашай базе не толькі нашы вучні, таму што існуюць мадэлі plus size, узроставыя мадэлі, якія таксама карыстаюцца попытам, таму мы заключаем дамовы і з такімі мадэлямі. Некаторыя з іх прайшлі навучанне ў прыватных мадэльных агенцтвах ці за мяжой. Але калі ёсць неабходнасць, мы можам дапамагчы атрымаць неабходныя навыкі і дзецям, і дарослым. Дарэчы — і гэта сусветная тэндэнцыя — сёння ўсё часцей шукаюць мадэляў 40+, 50+, 70+ і нават 90! Ёсць і такая мадэль у Брытаніі.

***— Гэта значыць, вы можаце прыняць такіх «нестандартных» на бюджэтную форму навучання?***

— На жаль, пакуль не. Але ў нас на базе школы можна атрымаць дадатковую адукацыю для дзяцей і моладзі мастацкага профілю з канкрэтызацыяй «мадэльнае мастацтва». Асобна ёсць групы для дзяцей ад трох гадоў і падлеткаў, а таксама мы распрацавалі курс «Школа іміджу і стылю» для людзей, старэйшых за 25 гадоў. На курсах чалавек працуе над сваім іміджам, рыхтуецца да мерапрыемстваў, вучыцца ўменню прэзентаваць сябе на публіцы. Падчас такіх курсаў можам убачыць чыйсьці патэнцыял і прапанаваць пайсці на кантракт да нас. Дзеці атрымліваюць эстэтычную і культурную адукацыю, вучацца этыкету, разуменню стылю, падбору колераў і іншаму. Па сутнасці, дзецям мы даём навыкі, якія раней атрымлівалі толькі арыстакраты...

***— Вы ў асноўным гаварылі пра дзяўчынак, а як жа хлопчыкі?***

— Яны вучацца, але іх менш, чым дзяўчынак, бо ў нашай краіне існуе стэрэатып, што хлопчыкі павінны займацца тэхнікай, роварамі ды футболам. А дзяўчынкі павінны ўмець шыць ды гатаваць. Многія таты нават не дапускаюць думкі, што іх сын будзе вучыцца мадэлінгу. Адзін вучань расказваў нам, што яго тата быў у сапраўдным шоку, калі даведаўся, што сын скончыў Нацыянальную школу прыгажосці і цяпер мае прафесію манекеншчыка. Трэба разумець, што наша праграма дадатковай адукацыі мае хутчэй культурна-эстэтычны кірунак. Прафесійнаму ж мадэлінгу ў нас, па сутнасці, навучаюць толькі, як я ўжо казаў, у групах 16—25-гадовых. Але нават у такіх групах у нас, вядома ж, больш дзяўчат. Некаторыя хлопчыкі, у якіх ёсць даныя і якія могуць падзарабіць на гэтым, часта вымушаны хавацца ад бацькоў. Але мне здаецца, што ўсё ж к паціху беларусы здолеюць справіцца са стэрэатыпамі, і тады сярод беларускіх мадэляў з'явіцца больш мужчын.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

**Открытое акционерное общество «Паритетбанк» (Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселева, 61а) сообщает, что 20 марта 2020 г. в 10.00 в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» состоится внеочередное общее собрание акционеров в очной форме по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, зал заседаний, 3-й этаж**

ПОВЕСТКА ДНЯ

Об утверждении Кодекса корпоративного управления открытого акционерного общества «Паритетбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 28 февраля 2020 г.

Лица, имеющие право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, могут ознакомиться с информацией (документами) по вопросам повестки дня 18–19 марта 2020 г. с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, каб. 306 либо 20 марта 2020 г. по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров при прохождении регистрации.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет проводиться 20 марта 2020 г. по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров с 9.20 до 9.50 при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Телефон для справок: +375 (17) 237 76 79.

Сайт: paritetbank.by

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5.»

УНП 100233809

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Отдых-2010» (Продавец), расположенного по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Драчковский с/с, 23, вблизи д. Волма**

**Лот № 1, состав:** 1. Административное здание, инв. № 614/С-23465, 105,8 кв. м. 2. Гостевой домик № 1, инв. № 614/С-41796, 74,8 кв. м. 3. Гостевой домик № 2, инв. № 614/С-42046, 75,7 кв. м. 4. Гостевой домик № 3, инв. № 614/С-42050, 76,3 кв. м. 5. Гостевой домик № 4, инв. № 614/С-42051, 117,3 кв. м. 6. Здание КПП, инв. № 614/С-23933, 40,7 кв. м. 7. Физкультурно-оздоровительный комплекс, инв. № 614/С-23462, 350,8 кв. м. 8. Овощехранилище, инв. № 614/С-23936, 110,5 кв. м. 9. Столовая, инв. № 614/С-23469, 698 кв. м. 10. Радиоузел, инв. № 614/С-23932, 11,4 кв. м. 11. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46148, 1370,6 кв. м. 12. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46146, 787,5 кв. м. 13. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46147, 799,1 кв. м. 14. Здание туалета, инв. № 614/С-46183, 14,1 кв. м. 15. Электрощитовая, инв. № 614/С-46182, 8,2 кв. м. 16. Артезианская скважина, инв. № 614/С-23466, 71 кв. м. 17. Водонапорная башня, инв. № 614/С-23939, объем 25 куб. м. 18. Сеть водоснабжения, инв. № 614/С-23937, 1303,2 кв. м. 19. Сеть кананализации, инв. № 614/С-23940, 1213,9 кв. м. 20. Тепловая сеть, инв. № 614/С-23938, 375,7 м. 21. Газопроводы высокого и низкого давления, инв. № 614/С-46057, 515,6 м. 22. Телефонная канализация, инв. № 614/С-46224, 11,2 кв. м. 23. Прочее имущество (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). Земельный участок для обслуживания объектов недвижимости № 1–22 площадью 6,0528 га с кадастровым номером 624800000001000405. Право постоянного пользования. Земельные участки для обслуживания части объекта недвижимости № 19: 1. Площадь 0,0049 га, кадастровый номер 624800000001005031. 2. Площадью 0,1302 га, кадастровый номер 624800000001005032. 3. Площадь 0,0001 га, с кадастровый номер 624800000001005033. 4. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005034. 5. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005035. 6. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005036. 7. Площадь 0,0027 га, кадастровый номер 624800000001005037. 8. Площадь 0,1324 га, кадастровый номер 624800000001005038. Право постоянного пользования. Начальная цена – 1 996 239,72 бел. руб. с НДС. Задаток – 250 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %

**Аукцион состоится 11.03.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. **Получатель** – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 11.03.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 09.03.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.2019

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»извещает о проведении на ЭТП «ТОРГИБЕЛ» повторных электронных торгов по продаже административного помещения МОАО «Красный металлист»**

**Лот № 250220001:** административное помещение, инв. № 700/D-137723, площадь – 1820,2 кв. м, г. п. – 1973. Адрес: г. Могилев, ш. Гомельское,15А-1. Обременение: аренда: площадь – 87,1 кв. м на 3 года. **Начальная цена продажи с НДС – 389 700,00 бел. руб. Задаток – 38 970,00 бел. руб.** Шаг электронных торгов – 5 %

**Условия:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола. 2. Условия оплаты приобретенного объекта согласовываются сторонами при заключении договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % от цены продажи предмета электронных торгов, а также стоимость услуг оператора ЭТП в течение 3 (трех) банковских дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов

Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения электронных торгов составляет 2000,00 бел. руб.

Дата и время начала проведения электронных торгов 23.03.2020 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения, утвержденного постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).

**Продавец:** МОАО «Красный металлист», 212013, г. Могилев, шоссе Гомельское, д. 15а, тел. 8 (0222) 76-27-16. Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Электронный адрес ЭТП: **http://торги.бел.** Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, г. Минск, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. **Получатель** – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах 23.03.2020. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 18.03.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2019.

**☎ Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ПАСЛЯ ПРАЎДЫ

## Чаму фэйкі ўяўляюць глабальную пагрозу?

**Распаўсюджванне каранавіруса COVID-19 па планеце — без перабольшвання, тэма нумар адзін навінавых стужак сусветных інфармагенцтваў. Праўда, на гэтай хвалі ўзнікае іншая праблема, калі паведамленні, мякка кажучы, не адпавядаюць сапраўднасці. Небяспека такога «інфармавання» настолькі крытычная, што трывогу ўзнялі не толькі ўласна журналісты, а і эксперты-медыкі. Сацыяльныя сеткі не павінны патураць распаўсюджванню дэзінфармацыі і лжывых чутак у сувязі з каранавірусам, заявіў генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя доктар Тэдрас Адханом Гебрэесус. «Мы не проста змагаемся з эпідэміяй. Мы змагаемся і з інфармацыйнай эпідэміяй, — сказаў кіраўнік СААЗ. — Ілжывыя навіны распаўсюджваюцца хутчэй і лягчэй, чым каранавірус, і гэта не менш небяспечна». СААЗ звярнулася да сацсетак і пошукавых сістэм з заклікам супрацьстаяць фэйкам. Чаму фальшыўкі ўяўляюць глабальную пагрозу?**

### Спагеці-дрэва і вяртанне Аляскі

Яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя ў адной з газет з'явілася нататка пра неверагодна пражэрлівую качку. Нібыта яна з'ела дзевятнаццаць іншых качак! Гэтая птушка дужа ўсхвалявала чытачоў і пэўны час служыла галоўнай тэмай для абмеркаванняў. Вось толькі ніякай качкі насамрэч не існавала. Яе выдумаў бельгійскі журналіст Роберт Корнелісен, каб выпрабаваць ступень даверлівасці публікі. Публіка і сапраўды аказалася вельмі даверлівая, а з лёгкай рукі бельгійца любую недакладную інфармацыю ў прэсе пачалі называць газетнай качкай (прынамсі, гэтая тэорыя аб паходжанні тэрміна з'яўляецца самай папулярнай).

Шэраг «качак» стаў класікай жанру. Вялікую Кітайскую сцяну знясуць, а на яе месцы пабудуюць аўтадарогу, пісалі ў ЗША ў 1899 годзе. «Качка па-пекінску» здалася настолькі праўдападобнай, што яе хутка падхапілі еўрапейскія СМІ. Заселенаму разумнымі істотамі Месяцу прысвяцілі аж шэсць опусаў у нью-ёркскай газеце ў 1835 годзе. «Месяцовая качка» не вытрымлівала ніякай крытыкі, аднак таксама была прынятая даверлівымі чытачамі за чыстую манету і ўвайшла ў гісторыю пад імем «вялікае месяцовае ашуканства».

Класіка журналісцкага гумару, пра якую дагэтуль пішуць у падручніках: у 1957 годзе карпарацыя «Бі-бі-сі» паведаміла пра тое, што швейцарскім земляробам удалося сабраць рэкордны ўраджай спагеці. І ўсё гэта дзякуючы цёплай зіме, а таксама перамозе над небяспечным шкоднікам — макаронным даўганосікам. У сюжэце сяляне здымалі доўгія спагеціны — не з вушэй, як можна было б выказаць здагадку, а з дрэў. Пасля эфіру рэдакцыю пачалі атакаваць тэлегледачы. Яны хацелі высветліць, як вырасціць спагеці-дрэва ў сябе на ўчастку. Журналісты ў адказ раілі ім змясціць спагеціну ў слоік з таматным соусам і чакаць, пакуль тая не пусціць карані.

У 2016 годзе выданне «Газета.ру» паведаміла, што група міжнародных юрыстаў, нібыта звязаная з урадам Расіі, шчыруе ў архівах Кангрэса ЗША. Мэта спецыялістаў — аспрэчыць працэдуру продажу Аляскі Расіяй ЗША ў часы Аляксандра II. Маўляў, Аляска была прададзеная Амерыцы незаконна, і цяпер самы час гэта выправіць. Навіна дайшла да ЗША і нарабіла там нямала шуму.

### Правіла трох «с»

Сучасную дэзінфармацыю сталі называць фэйкам (ад англійскага fake — падробка, фальшыўка). Падрабляюць не толькі брэнды, але і навіны. І гаворка тут ідзе не пра дапушчаныя журналістамі памылкі ў фактах, а пра масавую інфармацыйную містыфікацыю і наўмыснае распаўсюджванне дэзінфармацыі ў сацсетках і традыцыйных СМІ. Робіцца гэта дзеля таго, каб увесці ў зман і атрымаць ад гэтага камерцыйную або палітычную выгаду. Большасць старых добрых газетных «качак» усё ж выглядае бяскрыўднымі розыгрышамі, тады як фэйкавыя навіны часцей за ўсё прадугледжваюць пэўную карысць.

Фэйкі будуюцца на маніпуляцыях, перакручванні фактаў і на адкрытым падмане. Вялікую хлусню як прапагандысцкі прыём апісаў Адольф Гітлер у аўтабіяграфіі. На яго думку, людзі хутчэй павераць у вялікую хлусню, чым у маленькую, бо самі саромеюцца схлусіць па-буйному, — такім чынам, не павераць, што хтосьці здольны сказіць факты на 100 %. Стварэнне і распаўсюджванне абсалютнай хлусні апісвае ў культавым рамане «1984» Джордж Оруэл. Тэхніка падмены праўды на выдумку простая: ранейшыя паведамленні проста перапісваюцца, непатрэбныя пласты інфармацыі канфіскоўваюцца з архіваў. Жыхары выдуманай Акіяніі безумоўна вераць у фэйкі, нават калі ўчора ведалі сапраўдны стан спраў.

Фэйкавыя навіны (fake news) паўсталі на стыку жоўтай прэсы і палітычнай прапаганды. Не кожны чалавек, які купляе ў супермаркеце ежу, чытае яе склад і глядзіць на тэрмін прыдатнасці. Так і з навінамі. Людзі спачатку ўключаюць эмоцыі. Папулярнасць і эмацыянальная ўцягнутасць любога кантэнту трымаецца на правіле трох «с»: смерць, секс і страх. Часам называюць іншы ланцужок, які дапаўняе яшчэ і адна «г»: скандал, смех, сенсацыя і грошы. Фальшывая навіна атрымлівае свае першыя 1,5 тысячы чытачоў у сярэднім у шэсць разоў хутчэй, чым сапраўдная інфармацыя. Навукоўцы з медыялабараторыі Масачусецкага тэхналагічнага інстытута (MIT Media Lab) падлічылі: фэйкі ў дзесяць разоў хутчэй дасягаюць глыбіні 19, чым праўда глыбіні 10. Глыбіня ў дадзеным выпадку — даўжыня ланцужка паведамленняў.

### Страты — 79 мільярдаў долараў

Вынікі распаўсюджвання фэйкаў маюць не толькі эмацыянальныя, але і канкрэтныя матэрыяльныя абрысы. Кампанія CHEQ і Балтымарскі ўніверсітэт апублікавалі справаздачу, у якой прааналізавалі эканамічны ўрон ад фэйкавых навін ва ўсім свеце. Сусветны рынак страчвае на фэйках $79 млрд, паведаміў MediaPost. Паводле справаздачы, больш за ўсё фэйкі ўплываюць на рынак каштоўных папер. Ельская школа кіравання выявіла, што ўводзяць у зман артыкулы на інвестыцыйных сайтах, часова павышаючы цэны на акцыі. Патэнцыйная страта з-за такой дэзінфармацыі складае да 0,05 % кошту акцый — каля $39 млрд штогадовых страт.




За акцыямі ідзе фінансавая «дэза». Forbes і Economic Policy Institute правялі даследаванне і даведаліся, што фэйкі фінансавых кансультантаў у ЗША абыходзяцца ў $17 млрд. Падчас выбараў былі выяўленыя значныя выдаткі на ліквідацыю дэзінфармацыі як мінімум у 18 краінах. Абмяркоўваючы фэйкавыя навіны, парламент Вялікабрытаніі даведаўся, што вэб-сайт proBrexit Mainstream Network выдаткаваў 257 тысяч фунтаў стэрлінгаў ($336 тыс.) усяго за 10 месяцаў на працягу 2018 года, атрымаўшы 10,9 млн карыстальнікаў. У сваёй справаздачы Trend Micro паведаміў, што за $2600 можна купіць акаўнт у сацсетцы з больш чым 300 тысячамі падпісчыкаў; а $55 тыс. будзе дастаткова для фінансавання атакі ў Twitter, якая паспяхова дыскрэдытуе журналіста. $400 тысяч неабходна, каб паўплываць на змены палітыкі ў гандлёвых пагадненнях, паўплываць на выбары ці змяніць ход рэферэндуму.

### Інфармацыйная атрута

СМІ павінны адказна падыходзіць да распаўсюджвання інфармацыі і супрацьстаяць несапраўдным навінам. Пра гэта гаворыцца ў сумеснай заяве, якая летась была прынята ў Шанхаі на пасяджэнні прэзідыума Сусветнага медыясаміта. У мерапрыемстве, якое праводзілася з ініцыятывы агенцтва «Сіньхуа», удзельнічалі найбуйнейшыя СМІ, сярод якіх інфармацыйныя агенцтвы Associated Press, Reuters, «Бі-бі-сі», France Presse, ANSA, Kyodo, тэлекампанія Al Jazeera.

«Выпуск і распаўсюджванне фэйкавых навін парушае журналісцкую этыку і наносіць шкоду інтарэсам шырокай публікі. Медыя павінны несці сацыяльную адказнасць, гарантуючы, што паведамленні, якія выпускаюцца, заснаваны на фактах і з'яўляюцца дакладнымі, падаючы грамадскасці поўную, аб'ектыўную і непрадузятую інфармацыю. На СМІ ўскладзена місія барацьбы з дэзінфармацыяй, фальшывая інфармацыя павінна неадкладна вычышчацца, фэйкавыя навіны павінны байкатавацца», — абвясціў дакумент.

Вядома ж, сусветная праблема актуальная для нашай краіны. Айчыннае медыяполе сутыкнецца з нарастаннем пагроз у найбліжэйшай будучыні. Пра гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе з кіраўнікамі вядучых дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. «Падтасаваныя факты, фэйкі, дыпфэйкі, так званая постпраўда, калі аўдыторыяй умела маніпулююць, наўмысна адводзячы ад насамрэч важных праблем, — гэтая і іншая інфармацыйная атрута падобная да хімічнай зброі», — пераканаўчы беларускі лідар. У такой няпростай сітуацыі, на думку кіраўніка дзяржавы, важна весці сумленную і аб'ектыўную размову з аўдыторыяй, каб у няпростых умовах інфармацыйнага поля ўтрымаць увагу гледачоў, чытачоў і слухачоў. Так што асноўная «вакцына» ад постпраўды — тая самая праўда.

**Захар БУРАК.**

**Коммунальное унитарное предприятие**
**по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»**
сообщает о внесении изменений в извещение об открытом аукционе по продаже имущества
**ОАО «Гродненская обувная фабрика «Неман» 24 марта 2020 года:**

Строку 10 «Дата проведения аукциона» следует читать: **24 марта 2020 года**;
Строку 14 «Дата и время начала приема документов» следует читать: **27 февраля 2020 года, 8.00**;
Строку 15 «Дата и время окончания приема документов» следует читать: **18 марта 2020 года, 17.00.**

УНП 590727594

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «Стройтрест № 1»

**30 марта 2020 г. в 14.30 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Стройтрест № 1» по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 15**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и основных направлениях деятельности Общества на 2020 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета Общества в 2019 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год.
4. Утверждение годового отчета и годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2019 год. О выплате дивидендов за 2019 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2020 год и первый квартал 2021 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2020 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в очередном общем собрании акционеров, – 25 марта 2020 года.

С информацией о деятельности Общества за 2019 год и основных направлениях деятельности на 2020 год можно ознакомиться в рабочие дни с 10.03.2020 по 30.03.2020 с 9.00 по 18.00 с перерывом с 13.00 по 14.00 по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Платонова,15), в день проведения собрания – по месту его проведения с 9.00 по 13.00.

С иными материалами по вопросам повестки дня общего собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 23 по 30 марта 2020 г. с 9.00 по 18.00 с перерывом с 13.00 по 14.00 по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Платонова,15), в день проведения собрания – по месту его проведения с 9.00 по 13.00.

Регистрация участников собрания с 13.30 до 14.00. Для регистрации при себе иметь: акционеру Общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.

Начало работы собрания в 14.30.

УНП 100288960

# Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: **www.cpo.by** |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество «БПС Сбербанк», 220005, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б. **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1 – здание банка** (здание специализированное финансового назначения), общей площадью 2792,6 кв. м, инвентарный номер 252/С-10015, по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Олимпийская, 11А. Составные части и принадлежности: подвал, бокс для выгрузки ценностей.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания банка общей площадью 0,5854 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 2 380 502,88 белорусского рубля |
| **Лот № 2 – изолированное помещение** (помещение многофункциональное) общей площадью 694,2 кв. м, инвентарный номер 700/D-81771, по адресу: г. Могилев, пер. Мечникова 4-й, 3–1 | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 570 048,48 белорусского рубля |
| **Лот № 3 – расчетно-кассовый** центр (здание административно-хозяйственное) общей площадью 287 кв. м, инвентарный номер 342/С-10612, по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, рп Сосновый Бор, ул. Железнодорожная, д. 5а.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания расчетно-кассового центра общей площадью 0,0326 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 36 943,06 белорусского рубля |
| **Лот № 4 – встроенно-пристроенное здание** (помещение финансового назначения) общей площадью 1011,8 кв. м, инвентарный номер 252/D-87774, по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Олимпийская, 11–390 | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 528 456,96 белорусского рубля |
| **Лот № 5 – магазин № 48** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 2058,6 кв. м, инвентарный номер 100/С-1609, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Янки Купалы, 50А. Составные части и принадлежности: навес, металлическое ограждение, гараж, забор, ворота, площадка автотранспорта.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания магазинов общей площадью 0,2310 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 2 297 319,84 белорусского рубля |
| **Лот № 6 – нежилые помещения** в здании корпуса № 1 (торговое помещение) общей площадью 287 кв. м, инвентарный номер 500/D-680955, по адресу: г. Минск, ул. Гикало, 1–5 | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 1 235 512,80 белорусского рубля |
| **Лот № 7 – здание гаражей** (здание специализированное автомобильного транспорта) общей площадью 1716 кв. м, инвентарный номер 420/С-39090, по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Дубровня, ул. Садовая, д. 1Д. Составные части и принадлежности: мансарда ((А1/к)), пристройка (Б1/к), веранда (1).<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания гаражей общей площадью 0,5492 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 71 928,86 белорусского рубля |
| **Лот № 8 – склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) общей площадью 1708,6 кв. м, инвентарный номер 420/С-38183, по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, 49, здание склада в районе д. Огородники. Составные части и принадлежности: три пристройки (Б1/бл, В1/бл, Г1/к).<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве аренды (по 06.05.2032) для строительства и обслуживания здания складского помещения общей площадью 0,5446 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 77 066,64 белорусского рубля |
| **Лот № 9 – банк** (здание специализированное финансового назначения), общей площадью 2181,7, инвентарный номер 350/С-44423, по адресу: г. Гомель, ул. Якуба Коласа, 6А.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации административного здания общей площадью 0,1571 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 1 211 047,20 белорусского рубля |
| **Лот № 10 – административное помещение** (административное помещение) общей площадью 179 кв. м, инвентарный номер 300/D-6285, по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, 6А | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 218 722,46 белорусского рубля |
| **Лот № 11 – здание банка** (здание административно-хозяйственное) общей площадью 1672 кв. м, инвентарный номер 342/С-125304, по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Ленина, 49А. Составные части и принадлежности: крыльцо.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и содержания здания банка отделения в г. Светлогорске общей площадью 0,3753 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 824 490,72 белорусского рубля |
| **Лот № 12 – магазин** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 1176,8 кв. м, инвентарный номер 500/С-22967, по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 19Б/5.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля 131/625) для реконструкции существующих зданий и сооружений под торговые павильоны и строительство новых зданий, сооружений и торговых павильонов рынка по продаже строительных, электротехнических, сантехнических материалов и оборудования общей площадью 7,7627 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 2 419 647,84 белорусского рубля |

| | |
|---|---|
| **Лот № 13 – административное помещение 93** (административное помещение) общей площадью 28,9 кв. м, инвентарный номер 400/D-21593, по адресу: г. Гродно, ул. Ожешко, 49–93 | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 25 199,57 белорусского рубля |
| **Лот № 14 – магазин** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 581,7 кв. м, инвентарный номер 400/С-4211, по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Суворова, 27/1. Составные части и принадлежности: подвал (Б1/к), пристройка (В1/бл).<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля 9/100) для обслуживания жилого дома и магазинов № 14 и № 22 по ул. Суворова в г. Гродно общей площадью 0,2032 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 408 575,52 белорусского рубля |
| **Лот № 15 – встроенно-пристроенное помещение магазина** (торговое помещение) общей площадью 552,3 кв. м, инвентарный номер 100/D-611, по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 95 | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 606 746,88 белорусского рубля |
| **Лот № 16 – одноэтажное кирпичное здание магазина № 8** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 522,4, инвентарный номер 300/С-3129, по адресу: г. Гомель, ул. Чечерская, 3А. Составные части и принадлежности: подвал.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации магазина № 8 общей площадью 0,0600 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 494 205,12 белорусского рубля |
| **Лот № 17 – имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Клинокский с/с, п. Озерный, в следующем составе:**<br>**- база отдыха** (здание многофункциональное) общей площадью 2089 кв. м, инвентарный номер 615/С-266. Составные части и принадлежности: подвал (А3/к), беседки (1, 2, 3).<br>- **Овощехранилище** (здание нежилое) общей площадью 85,5 кв. м, инвентарный номер 615/С-1382.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания многофункционального здания общей площадью 2,0312 га.<br>- **Здание зимовника для пчел** (здание специализированное сельскохозяйственного назначения) общей площадью 44,5 кв. м, инвентарный номер 615/С-27933. Составные части и принадлежности: пристройка.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания обслуживания пчелопасеки общей площадью 0,1538 га.<br>- **Санитарно-обмывочный пункт на 10 мест на базе отдыха ОАО «Белпромстройбанк»** (здание специализированное для бытового обслуживания населения) общей площадью 249,8 кв. м, инвентарный номер 615/С-29048. Составные части и принадлежности: две пристройки.<br>**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для ведения подсобного хозяйства общей площадью 0,5867 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 1 439 327,28 белорусского рубля |
| **Дополнительная информация по лотам №№ 1, 2, 3, 4, 9, 11, 17:** при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона **www.cpo.by** *и www.ipmtorgi.by* | |
| **Обременения по лотам №№ 1, 2, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12, 15 – аренда. Подробная информация на сайтах www.cpo.by и www.ipmtorgi.by** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 0,1 до 3 % от цены продажи лота | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов – 02.04.2020 г. в 10.00. Окончание торгов – 02.04.2020 г. в 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 31.03.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06**<br>**E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

# Извещение о проведении 31 марта 2020 года торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир), принадлежащих ОАО «МАПИД»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | «Квартира 1» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 22-1 (1-й этаж, четырехкомнатная, общая площадь – 90,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 98,1 кв. м) | 235 440,00 | 3 000,00 |
| 2 | «Квартира 2» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 22-2 (1-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 73,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 79,3 кв. м) | 226 005,00 | 3 000,00 |
| 3 | «Квартира 3» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 22-3 (2-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 73,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 76,2 кв. м) | 217 170,00 | 3 000,00 |
| 4 | «Квартира 4» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 22-4 (2-й этаж, однокомнатная, общая площадь – 42,0 кв. м, общая площадь по СНБ – 44,0 кв. м) | 136 400,00 | 3 000,00 |
| 5 | «Квартира 5» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 22-5 (2-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 55,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 58,1 кв. м) | 174 300,00 | 3 000,00 |
| 6 | «Квартира 6» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 22-6 (2-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 73,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 76,2 кв. м) | 217 170,00 | 3 000,00 |
